

Што за новыя прадукты ў салдацкім пайку?

СТАР. 3



Як у Полацку чарніцы збіралі

СТАР. 6



Святлана Святлічная пра кіно і жыццё

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 ліпеня 2014 г. СЕРАДА № 136 (27746) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## АПОРНЫ ПУНКТ У АФРЫЦЫ

### Ім для нашай краіны можа стаць Мазамбік

**Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Мазамбіка Алберту Вакіна, паведамляе БЕЛТА.**

Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў надзею, што ў выніку візіту прэм'ер-міністра бакі дасягнуць значнага прагрэсу ў двухбаковых стасунках. Паводле слоў Прэзідэнта, паспяховаму развіццю гэтага працэсу ў тым ліку можа садзейнічаць гісторыя адносін, якая бярэ пачатак з савецкіх часоў.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Мазамбік з'яўляецца вельмі перспектыўнай і багатай дзяржавай, перш за ўсё сваімі нетрамі і карыснымі выкапнямі. Прэзідэнт канстатаваў, што эканомікі дзвюх краін узаемадапаўняльныя і не канкурыруюць адна з адной. Разам з тым ён заўважыў, што двухбаковы тавараварот, які знаходзіцца на ўзроўні прыкладна $10 млн, не адпавядае патэнцыялу дзвюх дзяржаў. «У нас да гэтага часу не створана нарматыўна-прававая база нашых адносін, і ваш візіт паслужыць інтэнсіфікацыі адносін і ў гэтай частцы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Мы гатовы з вамі супрацоўнічаць па ўсіх напрамках, закрытых тэм для супрацоўніцтва ў нас няма», — дадаў беларускі лідар.

У сваю чаргу Алберту Вакіна адзначыў, што існуе шмат напрамкаў, па якіх Беларусь і Мазамбік маглі б супрацоўнічаць, і гэта ў тым ліку сфера сельскай гаспадаркі і вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі.

■ Знешняя эканоміка

## НОВЫ АДРАС БЕЛАРУСКАГА БІЗНЕСУ

### Афрыканская краіна прапануе нашым прадпрымальнікам сумесную распрацоўку радовішчаў прыроднага газу

**Пра гэта паведаміў выканаўчы дырэктар Канфедэрацыі гандлёвых асацыяцый Мазамбіка Раджэрыа Манюэль на беларуска-мазамбікскай бізнес-сустрэчы, якая адбылася ў Беларускай гандлёва-прамысловай палаце.**

### Экспартуем тэхналогіі

«У Мазамбіку знойдзены вялікія запасы прыроднага газу, і гэтая сфера можа быць перспектыўнай для інвеставання з боку прадстаўнікоў беларускага бізнэсу, а таксама для супрацоўніцтва», — адзначыў выканаўчы дырэктар.

Сёння ў распрацоўцы і здабычы прыроднага газу ў Мазамбіку занятыя кампаніі з Італіі і ЗША. Акрамя таго, разведаны радовішчы вугалю, будуюцца вугальныя шахты. «Мы зацікаўлены ў супрацоўніцтве ў гэтай сферы з прадстаўнікамі малога і сярэдняга бізнесу Беларусі, якія змогуць узяць удзел у рэалізацыі буйных праектаў», — падкрэсліў Раджэрыа Манюэль. Намеснік старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір Улаховіч адзначыў, што сумесная распрацоўка радовішчаў прыроднага газу — гэта перспектыўная прапанова: «Афрыка багатая на мінеральныя рэсурсы і карысныя выкапні. Беларусь, у сваю чаргу, можа прапанаваць тэхналогіі, напрыклад, тыя, якія прымяняе «Беларуськалій». У гэтым напрамку ў нас ужо ёсць партнёры ў Паўднёва-Усходняй Азіі, Лацінскай Амерыцы. У Афрыцы гэтыя тэхналогіі таксама могуць быць запатрабаваны».

### Дапаможам накарміць краіну і кантынент?

Міністр гандлю і прамысловасці Мазамбіка Арманда Інрога заявіў, што яго краіна зацікаўлена ў беларускім вопыце і распрацоўках у сферы сельскай гаспадаркі. «Афрыка — гэта кантынент, які адчувае праблемы з харчовай бяспекай, а Беларусь з'яўляецца важным сельгасвытворцам, а таксама экспарцёрам сельскагаспадарчых прадуктаў. Таму мы гатовыя і хочам вучыцца ў Беларусі, як выраблядь сельгаспрадукцыю і развіваць сельскую гаспадарку, каб у перспектыве стаць адной з краін — экспарцёраў гэтай прадукцыі, да таго ж у Мазамбіку ёсць 35 млн га ворнай зямлі», — падкрэсліў міністр. Дарэчы, не выключана стварэнне сумесных з Беларуссю прадпрыемстваў. Тым больш што Беларуская гандлёва-прамысловая палата і Канфедэрацыя гандлёвых асацыяцый Мазамбіка падпісалі мемарандум аб узаемаразуменні.

Уладзімір Улаховіч адзначыў, што дакумент стане своеасаблівай асновай для развіцця бізнес-кантактаў паміж краінамі. Арганізацыі плануюць наладзіць абмен інфармацыяй, што дапаможа абодвум бакам у пошуку патэнцыйных партнёраў. Раджэрыа Манюэль у сваю чаргу падкрэсліў, што падпісанне мемарандума стане стымулам для развіцця ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва паміж прадпрымальнікамі дзвюх краін.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**



Фота БЕЛТА.

# МАЛАДОЕ ЗБОЖЖА

## ПЕРШЫ МІЛЬЁН

**Беларускія аграрыі ўжо намалацілі мільён тон збожжа, паведамляе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання.**

Па стане на 22 ліпеня, намалот збожжа ў краіне перавысіў 1 мільён тон. А гэта, дарэчы, удвая больш, чым на аналагічную дату 2013 года. Больш за ўсіх пастараліся гаспадаркі Гомельскай (каля 330 тыс. т), Брэсцкай (277,5 тыс. т) і Мінскай (196,2 тыс. т) абласцей.

Пры гэтым сярэдняя ўраджайнасць па рэспубліцы складае 37,8 ц/га. Ёсць меркаванне, што сёлета можна разлічваць на рэкордны ўраджай збожжа. Нагадаем, што збожжавыя і зернебабовыя трэба сабраць з плошчы 2 427,8 тыс. га. Ужо ўбрана каля 278 тыс. га, або 11,4%.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**




*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Леанід ЗАЯЦ, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

***«З улікам падтрымкі аграпрамысловага комплексу кіраўніком дзяржавы, урадам мы не проста павінны, а абавязаны забяспечыць якаснае развіццё АПК, абапіраючыся перш за ўсё на тэхналогіі. Дыктатура тэхналогій павінна быць на першым месцы. Адразу дыктатура, потым — чалавек. Ён павінен падпарадкавацца выкананню ўсіх нарматыўных параметраў, выкананню тэхналогій. На гэтым мы знойдзем вялікія грошы. Калі будзем мець належную прыбаўку ў вазе, удой 6 тысяч кг на карову за год, нарматыўны расход кармоў, то, вядома, будзем мець і новую эканоміку сельскай гаспадаркі».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.07.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10280,00 | ■ |
| Еўра | 13890,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 293,00 | ■ |
| Укр. грыўня | 879,38 | ▼ |

■ Рабочыя моманты

## БУДЗЕМ ПРАЦАВАЦЬ ПА НОВЫМ КОДЭКСЕ

### Муж-прадпрымальнік зможа ўзяць водпуск па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў, а спартсмена можна будзе звольніць пры недасягненні спартыўных вынікаў

**25 ліпеня ўступіць у сілу Закон «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь». «Звязда» паспрабавала разабрацца ў асноўных навацыях, якія нас чакаюць.**

### Новаўвядзенні, што тычацца працоўных правоў і гарантый работнікам

- Наймальніку пры размяшчэнні аб'явы аб працаўладкаванні забаронена ўказваць узрост і месца жыхарства ў якасці крытэрыю для адбору работніка. Калі работнік лічыць, што адмова ў прыёме на працу або звальненне былі абумоўлены менавіта гэтымі абставінамі, напрыклад, калі чалавека звальняюць з працы ці не прымаюць на працу па прычыне дасягнення пенсійнага ўзросту, ён мае права адстойваць свае інтарэсы ў судзе.
- Пашырана катэгорыя асоб, якія маюць права на водпуск па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім трох гадоў.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



### РАДА ПАВЯЛІЧЫЛА ЎЗРОСТ ВАЕННААБАВЯЗАНЫХ ЗАПАСУ

Вярхоўная Рада павялічыла ўзрост ваеннаабавязаных, якія знаходзяцца ў запасе. Для большасці званняў ўзроставая планка паднімецца да 60 гадоў, для вышэйшага афіцэрскага складу — да 65. За адпаведныя змены ў закон «Аб вайсковым абавязку і вайсковай службе» прагаласавалі 232 дэпутаты пры неабходным мінімуме ў 226 галасоў. Згодна з дзейным заканадаўствам, прызыўны ўзрост мужчын у мірны час складае ад 18 да 25 гадоў. Гранічны ўзрост службы пры гэтым даходзіць да 45 гадоў для малодшага афіцэрскага і сяржанцкага-старшынскага складу, да 50 і 55 для старэйшага афіцэрскага складу і да 60 гадоў для вышэйшага афіцэрскага складу. Раней Вярхоўная Рада зацвердзіла ўказ прэзідэнта Украіны аб частковай мабілізацыі, якая ўводзіцца на тэрыторыі ўсёй краіны. Яна пачнецца на працягу 45 сутак з дня ўступлення дакумента ў сілу і мае на ўвазе прызыў ваеннаабавязаных, рэзервістаў, а таксама пастаўку транспартных сродкаў у аб'ёмах, «вызначаных мабілізацыйнымі планамі з улікам рэзерву».

### КІТАЙ ВЫДАСЦЬ КРЭДЫТ ВЕНЕСУЭЛЕ Ў АБМЕН НА НАФТУ

Старшыня КНР Сі Цзіньпін і прэзідэнт Венесуэлы Нікалас Мадура падпісалі серыю пагадненняў аб эканамічным супрацоўніцтве, якія прадугледжваюць выдзяленне Кітаем крэдыту на 4 мільярды долараў. У абмен Венесуэла будзе пастаўляць у КНР нафту. У ліку дасягнутых дамоўленасцяў — пагадненні аб сумеснай працы ў сферы фінансаў, нафтавай і горнай прамысловасці, сельскай гаспадарцы.

ISSN 1990 - 763X

14136

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### АБЯЗВОДЖВАННЕ ПРЫВОДЗІЦЬ ДА ЛІШНЯЙ ВАГІ



Нацыянальная служба аховы здароўя Вялікабрытаніі адзначае: «Калі нармальная колькасць вады ў арганізме зніжаецца, то парушаецца баланс мінералаў (соляў і цукру). Гэта вельмі згубна адбіваецца на функцыях арганізма». Узнікненне пачуцця смагі звязана з тым, што абязводжванне ўжо наступіла. З-за дэфіцыту вады арганізм церпіць стрэс. Гэта прыводзіць да павелічэння вагі і розных захворванняў. Пры абязводжванні арганізма не хапае энергіі. З-за гэтага можа з'явіцца «лжывае» пачуццё голаду. Таму мы часта ядзім больш, чым павінны, замест таго, каб проста выпіць шклянку вады. Пры ўзнікненні пачуцця голаду неўзабаве пасля прыёму ежы можна выпіць гарбату з зёлак ці ваду. Пасля гэтага голад павінен знікнуць. Абязводжванне пагаршае і шэраг захворванняў. Найбольш актуальныя з іх — гэта хваробы выдзяляльнай сістэмы і астма. Пры недахопе вады таксіны і кіслотныя адходы назапашваюцца ў арганізме, паколькі ныркі не ў стане эфектыўна працаваць. У выніку ўзнікаюць інфекцыі нырак і мачавога пузыра. Дыхальныя шляхі пры дэфіцыце вады скарачаюцца, каб захаваць вадкасць. Даследаванні паказалі, што выпрацоўка гістаміну, які выклікае алергічную рэакцыю, пры абязводжванні павялічваецца ў геаметрычнай прагрэсіі.

КОРАТКА

У Мінску ў першым паўгоддзі для грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 231 тыс. кв.м агульнай плошчы жылля, або 39,4% ад агульнага аб'ёму ўведзенага.

Забарона на продаж піва ў тары звыш 2 літраў уступае ў сілу з 22 ліпеня. Акрамя гэтага, пастанова таксама змяшчае пералік месцаў, у якіх не можа ажыццяўляцца рознічны гандаль півам і слабаалкагольнымі напіткамі з аб'ёмнай доляй этылавага спірту не больш за 7%.

Першы ў Беларусі гандлёвы цэнтр стокавага гандлю адкрыецца ў пачатку 2015 года. Сутнасць ідэі ў тым, што на плошчы 15 тыс. кв.м будуць прадстаўлены магазіны стокавага гандлю, дысконтныя магазіны, а таксама магазіны, гандлёвая палітыка якіх прадугледжвае пастаянныя распродажы.

«Атлант Тэлекам» з 1 жніўня павысіць плату за інтэрнэт. Кошт тарыфных планаў «Wi-Fi+TV», «Wi-Fi+ Рэгіён», «Прэміум Плюс» павялічыцца на Br20 тыс. без уліку ПДВ. Кошт усіх астатніх тарыфных планаў для карыстальнікаў, падключаных па ADSL- і Ethernet-тэхналогіях, павялічыцца на Br10 тыс. без уліку ПДВ.

У Беларусі пашыраюцца межы цэнавых груп цыгарэт з фільтрам.

# «Звязду» цікава не толькі чытаць!

## З ёй і выйграваць яшчэ можна!»

**Сто гадоў без малога газеце «Звязда». А таму дакладна вядома, што некаторыя чытачы выбралі выданне, так бы мовіць, не самі — з «падачы» сваіх бацькоў… А тыя некалі — сваіх… «Звязда» і сапраўды газета сямейная.**

Чарговым сведчаннем таму стаў нядаўні розыгрыш прызоў. Вы не паверыце (як не паверылі мы, а перад гэтым і самі шчаслівчыкі!), але два (з трох) трымеры выйгралі вельмі блізкія сваякі: адзін — Іван Іванавіч Гаральчук з Мінска, другі — яго родная пляменніца Юлія Сямёнаўна Мішчук з вёскі Ляхаўцы Маларыцкага раёна.

— «Звязду» мы выпісваем пастаянна і гадоў 15 ужо. Гэта ініцыятыва майго мужа Генадзя.

СТАР. 2




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Забіраць свой прыз Юлія Сямёнаўна МІШЧУК прыехала з сястрой Ганнай, пляменніцай Лізай і сынам Аляксеем.**

# У ІНТАРЭСАХ СПАЖЫЎЦА

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заяўляе пра неабходнасць развіцця канкурэнцыі ў сферы гандлю прадуктамі харчавання і таварамі народнага спажывання**

Пры гэтым асаблівую ўвагу неабходна надаць якаснаму абслугоўванню сельскага насельніцтва і не дапусціць знікнення з рынку магазінаў крокавай даступнасці. Пра гэта ішла размова на сустрэчы кіраўніка дзяржавы са старшынёй савета дырэктараў ТАА «Тытунь-Інвест» Паўлам Тапузідзісам аб развіцці ў Беларусі аб'ектаў гандлёвай сеткі, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

«Вы гатовыя пабудаваць да 130 гандлёвых цэнтраў па ўсёй краіне, некалькі сярэдніх і пару буйных. Думаю, гэта цалкам магчыма ў Беларусі», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў яго не выклікаюць неспакою маштабы адпаведнай прапановы, паколькі Павел Тапузідзіс зарэкамендаваў сябе як сумленны прадпрымальнік. «Хацелася б, каб у Беларусі была дастатковая колькасць такіх прадпрымальнікаў, якія ў той ці іншай сферы будуць маякамі і ўзорамі таго, як трэба дзейнічаць і будаваць падобныя прадпрыемствы», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў пажаданне, каб заможныя грамадзяне Беларусі, прадпрымальнікі больш актыўна інвеставалі менавіта ў сваёй краіне. «Нам бы пабольш інвестыцый, і менавіта грамадзян Беларусі — людзей, якія жывуць тут, зарабляюць і імкнуцца пашыраць свой бізнэс. Я гэта абсалютна вітаю, вы гэта ведаеце. На гэтую тэму ў нас з вамі ўжо была даўняя размова. Добра, што вы выконваеце тое, што абяцалі», — сказаў беларускі лідар.

Разам з гэтым Прэзідэнт нагадаў, што даручаў органам улады вельмі акуратна, асабліва ў Мінску, ставіцца да ўзвядзення гандлёвых аб'ектаў, каб буйныя гандлёвыя сеткі не задушылі крамы крокавай даступнасці. Аляксандр Лукашэнка таксама бачыць станоўчы эфект ад развіцця канкурэнцыі ў сферы гандлю, што спрыяе забеспячэнню насельніцтва таварамі па разумных цэнах.

Аляксандр Лукашэнка таксама закрануў функцыянаванне сферы гандлю на вёсцы і ў невялікіх раённых гарадах. Паводле яго слоў, і тут за кошт развіцця канкурэнцыі ёсць магчымасць зніжэння цэн на прадукцыю. «У нас ёсць прадпрымальнікі, гатовыя ўзяць цэлыя вобласці і сельскі гандаль, дайсці да кожнага селяніна, каб ён абслугоўваўся так, як належыць, — адзначыў Прэзідэнт. — Белкаапсаюз актыўна пярэчыць гэтаму. Але мы спажыўкааперацыі далі час, каб яны навучыліся нармальна абслугоўваць беларускіх сялян і каб цэны не былі завоблачнымі. А то атрымліваецца так, што сяляне вырабляюць прадукцыю, а ў вёсцы ім даводзіцца купляць яе па цэнах вышэйшых, чым у горадзе».

«Зразумела, што і лагістыка, і дастаўка таксама патрабуюць грошай. Але трэба шукаць іншыя формы, каб не падымаць на сяле цэны на прадукты харчавання першай неабходнасці, вопратку. І перш за ўсё рынак гэта павінен сфарміраваць, а каб ён сфарміраваў, патрэбна і там канкурэнцыя», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама заявіў пра неабходнасць больш актыўнага прасоўвання аб'ектамі гандлю тавараў беларускай вытворчасці. «Калі ў Беларусі ёсць тавар, ён павінен быць выгадна прадстаўлены ў любой краме», — сказаў Прэзідэнт. «Вядома, я буду падтрымліваць і настойваць, каб прадавалі ўсё ж такі беларускае. Гэтае патрабаванне прасоўваецца мною ў мяккай форме, але мы будзем больш актыўныя ў гэтым кірунку, і вы павінны разумець, што трэба прадаваць і беларускія тавары. Па прадуктах харчавання тут праблем асаблівых няма, але трэба, каб быў прадстаўлены і асартымент адзення, абутку і гэтак далей», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу, што і самому гандлю неабходна больш актыўна патрабаваць і заахвочваць вытворцаў тавараў да выпуску запатрабаванай прадукцыі.

# БУДЗЕМ ПРАЦАВАЦЬ ПА НОВЫМ КОДЭКСЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Закон дае такое права працуючаму бацьку або іншаму сваяку не толькі замест маці, якая працуе па працоўным дагаворы, але і калі яна з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, прыватным натарыусам, адвакатам, творчым работнікам, ажыццяўляе рамесніцкую дзейнасць, дзейнасць у сферы аграэкатурызму. Права на перадачу водпуску ў гэтых жанчын узнікае, калі іх дзейнасць не прыпыняецца ў сувязі з доглядам дзіцяці да трох гадоў. Пры гэтым пры наяўнасці ў сям'і дваіх і больш дзяцей ва ўзросце да трох гадоў водпуск прадастаўляецца адной асобе.

• Водпуск па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім трох гадоў перарываецца ў выпадку прадастаўлення маці водпуску па цяжарнасці і родах і працягваецца па яго заканчэнні.

• Графік працоўных водпускаў зацвярджаецца наймальнікам і ўзгадняецца прафсаюзам, калі гэта прадугледжана калектыўным дагаворам. Пры складанні графіка водпускаў наймальнік павінен улічваць меркаванне работніка, калі гэта не перашкаджае нармальнай дзейнасці арганізацыі, а таксама рэалізацыі права на адпачынак іншых работнікаў.

• Работнікам, якія атрымліваюць па накіраванні наймальніка сярэднюю спецыяльную або вышэйшую адукацыю, незалежна ад таго, якая яна па ліку — першая або другая — прадастаўляецца аплачаны вучэбны водпуск.

• Запаўняць камандзіровачныя пасведчанні будзе неабавязкова, за выключэннем выпадкаў, калі камандзіровачнае пасведчанне з'яўляецца дакументам, які гарантуе дадатковыя правы (гэта тычыцца супрацоўнікаў сістэмы МУС, КДБ, пракуратуры і інш.). Вырашаць, выпісваць камандзіроўку работніку ці не, будзе сам наймальнік.

### Вітаюцца гнуткія формы занятасці

✓ Індывідуальныя прадпрымальнікі або мікраарганізацыі змогуць заключаць з работнікамі па пагадненні бакоў тэрміновы працоўны дагавор без уліку характару працы, якая прадастаўляецца, ці ўмоў яе выканання. Іншымі словамі, можна будзе заключаць тэрміновы працоўны дагавор для выканання работы пастаяннага характару. Гэта дасць малому бізнесу магчымасць мабільна рэагаваць на змены эканамічнай сітуацыі на рынку працы. Да таго ж, гэтая норма стане стымулам да таго, каб індывідуальныя прадпрымальнікі і мікраарганізацыі афармлялі адносіны з работнікамі на законных падставах, забяспечваючы тым самым ім сацыяльна-працоўныя гарантыі.

✓ Штодзённая працягласць працоўнага часу ва ўліковым перыядзе не павінна перавышаць 12 гадзін у сярэднім за ўліковы перыяд (квартал, паўгоддзе, год). Гэта азначае, што працу работнікаў можна будзе планаваць у асобныя дні працягласцю больш за 12 гадзін, а ў асобныя дні — менш за 12 гадзін. Пры гэтым павінна быць выканана абмежаванне па працягласці рабочага часу за ўліковы перыяд — у сярэднім не больш за 12 гадзін.

✓ Максімальная норма звышурочнай працы павялічана да 180 гадзін (гэта на 60 гадзін больш за норму, што дзейнічае зараз). Таксама вызначана, што звышурочныя работы для кожнага работніка не павінны перавышаць 10 гадзін у працоўны тыдзень, а працягласць штодзённай працы з улікам звышурочных работ — 12 гадзін. Пры гэтым прыцягненне да звышурочных работ па-ранейшаму павінна ажыццяўляцца на добраахвотнай аснове, акрамя выключных выпадкаў, калі работнікі могуць прыцягвацца да гэтых работ без іх згоды.

### Работа па сумяшчальніцтве

• Работнік зможа заключаць працоўныя дагаворы аб працы па сумяшчальніцтве з неабмежаванай колькасцю наймальнікаў. Пры гэтым пры прыёме работніка па сумяшчальніцтве (як пры ўнутраным, так і пры знешнім) з ім заключаецца асобны працоўны дагавор.

• Будзе дазволена працаваць па сумяшчальніцтве на працягу поўнай нормы працоўнага часу работнікам, якія знаходзяцца ў водпусках без захавання або з частковым захаваннем зарплаты, прадастаўленых па ініцыятыве наймальніка.

• Здымаецца забарона на працу па сумяшчальніцтве для кіраўнікоў камерцыйных арганізацый прыватнай формы ўласнасці. Але захоўваецца абмежаванне ў працы па сумяшчальніцтве для кіраўнікоў дзяржарганізацый, а таксама кіраўнікоў недзяржаўных арганізацый, у статутным фондзе якіх доля дзяржуласнасці складае не менш за 50% (гэта абмежаванне вызначана законам «Аб барацьбе з карупцыяй»).

### Кампенсацыі за працу ў звышурочны час, у дзяржаўныя святы, святочныя і выхадныя дні

✓ За працу ў звышурочны час, у дзяржаўныя святы, святочныя і выхадныя дні звыш зарплаты, налічанай за названы час, робіцца даплата, якая не можа быць ніжэйшай за здзельныя расцэнкі для работнікаў са здзельнай аплатай працы, ніжэйшай за гадзінныя тарыфныя стаўкі (аклады) — для работнікаў з пагадзіннай аплатай працы, а таксама для работнікаў, якія атрымліваюць службовыя аклады. Канкрэтны памер даплаты вызначаецца працоўным дагаворам і (або) лакальным нарматыўным прававым актам. Памер даплаты ў бюджэтных арганізацыях вызначаецца ўрадам або ўпаўнаважаным ім органам.

### Праца на даму

• Работнік-надомнік зможа працаваць не толькі на даму, але і ў любым іншым памяшканні па яго выбару, у тым ліку ў іншай мясцовасці — па-за месцам размяшчэння наймальніка. Надомнікам можна будзе працаваць як на сваім абсталяванні і выкарыстоўваць свае інструменты, матэрыялы, так і абсталяванне, інструменты, матэрыялы наймальніка.

• У дачыненні да такіх работнікаў павінны выконвацца ўсе патрабаванні працоўнага заканадаўства (у прыватнасці, з імі павінен заключацца пісьмовы працоўны дагавор). Гэта забяспечыць работніку гарантыі па своечасовай аплаце працы, прадастаўленні водпуску, захаванню заработнай платы за перыяд часовай непрацаздольнасці.

### Працоўныя адносіны ў прафесійным спорце

✓ З'явіліся дадатковыя падставы для скасавання працоўнага дагавора са спартсменам: спартыўная дыскваліфікацыя; выкарыстанне допінгу ў спорце; недасягненне пэўных спартыўных вынікаў пры ўмове, што дасягненне гэтых вынікаў было прадугледжана працоўным дагаворам і спартсмену былі створаны наймальнікам неабходныя ўмовы для іх дасягнення.

✓ У працоўным дагаворы замацаваны абавязак спартсмена, трэнера выплаціць наймальніку грашовую кампенсацыю ў выпадку скасавання працоўнага дагавора па прычыне недасягнення вынікаў, прадугледжаных працоўным дагаворам (калі наймальнік стварыў спартсмену неабходныя для гэтага ўмовы).

### Скасаванне працоўных дагавораў з іншымі катэгорыямі работнікаў

• Стане магчымым спыненне працоўнага дагавора па абставінах, не залежных ад волі бакоў. Гэта датычыцца выпадкаў, калі на падставе заканадаўства ўзнікаюць абмежаванні па выкананні работнікам яго працоўных функцый (напрыклад, пазбаўленне вадзіцельскіх правоў работніка, які працуе кіроўцам).

• Дзяржаўная службовая асоба будзе вызваляцца ад займанай пасады ў выпадку непадпісання або парушэння ім абавязацельстваў па выкананні абмежаванняў, устаноўленых законам «Аб барацьбе з карупцыяй». Так, згодна з арт. 17 гэтага закона дзяржаўная службовая асоба не мае права, у прыватнасці, займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю асабіста або праз давераных асоб, аказваць садзейнічанне блізкім сваякам у ажыццяўленні прадпрымальніцкай дзейнасці, выкарыстоўваючы службовае становішча, а таксама выконваць іншую аплатную работу, не звязаную з выкананнем працоўных абавязкаў па месцы асноўнай працы (акрамя выкладчыцкай, навуковай, культурнай, творчай дзейнасці і медыцынскай практыкі).

**Святлана БУСЬКО.**

***Кампетэнтна***

**Начальнік юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціна МАСЛОЎСКАЯ:**

*Новая рэдакцыя закона накіравана, з аднаго боку, на стварэнне неабходных прававых умоў для павышэння эфектыўнасці вытворчасці і выкарыстання працоўных рэсурсаў, развіцця прадпрымальніцкай ініцыятывы, а з другога боку — на забеспячэнне абароны правоў і інтарэсаў работнікаў. Падверглася зменам больш за 180 артыкулаў, але пры гэтым захавалася і канцэпцыя, і структура дзейнага кодэкса.*

*Змены ў Працоўным кодэксе можна згрупаваць па некалькіх кірунках. Першы — гэта рэалізацыя рашэнняў Канстытуцыйнага суда; другі — рэгуляванне працоўных адносін у прафесійным спорце; трэці — павышэнне гнуткасці працоўнага заканадаўства з улікам палажэнняў Дырэктывы № 4 «Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляванні дзелавой актыўнасці ў Рэспубліцы Беларусь»; і чацвёрты — удасканаленне нормаў Працоўнага кодэкса з улікам правапрымяняльнай практыкі.*

■ Глабальны кантэкст

# ЧАЛАВЕК — ГЭТА ГУЧЫЦЬ

## НАША КРАІНА ПА РЭЙТЫНГУ САЦЫЯЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ ПЕРШАЯ СЯРОД КРАІН СНД

Такое паняцце, як індэкс сацыяльнага развіцця, на сусветным узроўні пачало вылучацца зусім нядаўна — яго распрацавала ў 2013 годзе каманда спецыялістаў Гарвардскага ўніверсітэта пад кіраўніцтвам прафесара гэтага ўніверсітэта Майкла Портэра. Аўтары даследавання лічаць, што эканамічнае развіццё з'яўляецца неабходнай, але недастатковай умовай сацыяльнага прагрэсу. Індэкс не ўключае паказчыкі эканамічнага развіцця краін свету (такія, як узровень ВУП), а прызначаны для ацэнкі сацыяльнага развіцця ў той ці іншай краіне. Паколькі даследаванне ацэньвае дасягненні ў сацыяльнай сферы асобна ад эканамічных індыкатараў, гэта дазваляе глыбей вывучыць узаемасувязь паміж эканамічным і сацыяльным развіццём.

Індэкс ахоплівае 132 краіны і грунтуецца на камбінацыі звестак з апытанняў грамадскай думкі (12%), ацэнак экспертаў у галіне развіцця (25%) і статыстычнай інфармацыі міжнародных арганізацый (61%).

Пры вызначэнні поспехаў той ці іншай краіны ў галіне сацыяльнага развіцця ўлічваецца звыш 50 паказчыкаў, аб'яднаных у тры асноўныя групы:

1. Асноўныя патрэбы чалавека: харчаванне, доступ да асноўнай медыцынскай дапамогі, забеспячэнне жыллём, доступ да вады, электрычнасці і санітарных паслуг, узровень асабістай бяспекі.

2. Асновы дабрабыту чалавека: доступ да базавых ведаў і ўзровень пісьменнасці насельніцтва, доступ да інфармацыі і сродкаў камунікацыі, узровень аховы здароўя, экалагічная ўстойлівасць.

3. Магчымасці развіцця чалавека: узровень асабістых і грамадзянскіх свабод, забеспячэнне правоў і магчымасцяў чалавека прымаць рашэнні і рэалізоўваць свой патэнцыял.

Наша краіна, паводле сёлетняга рэйтынгу, заняла 58-е месца. Гэта найлепшы паказчык сярод краін СНД: Украіна займае 62-е месца, Азербайджан — 74-е, Расія — 80-е, Казахстан — 86-е. «Тройка» першых выглядае так: Новая Зеландыя, Швейцарыя, Ісландыя.

Асабліва высокія паказчыкі, паводле аналізу экспертаў, у задавальненні асноўных патрэб чалавека і яго дабрабыту. Жыхары нашай краіны добра і якасна харчуюцца, забяспечаны жыллём, могуць не хвалявацца пра сваю бяспеку, маюць доступ да адукацыі, да сродкаў камунікацыі і да медыцынскага абслугоўвання. Гэта, дарэчы, пацвярджае даныя іншага даследавання: у апублікаваным ААН рэйтынгу чалавечага развіцця Беларусь уваходзіць у групу краін з высокім узроўнем гэтага паказчыка.

***«Звязда» пацікавілася думкай айчынных экспертаў аб выніках рэйтынгу***



**Ларыса БАГДАНОВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па працы і сацыяльных пытаннях:**

— У нас жа ў Канстытуцыі закладзена, што Беларусь — гэта сацыяльна арыентаваная дзяржава. І гэта не проста дэкларацыя на словах. У нашай краіне гэта палітыка насамрэч рэалізавана і працягвае рэалізоўвацца ва ўсіх сферах. Калі, напрыклад, пагледзець на плату за праезд у грамадскім транспарце ці за камунальныя паслугі, то ў нас усе слаі насельніцтва маюць дзяржаўную падтрымку. А гэта і ёсць сацыяльная палітыка дзяржавы. Яркім прыкладам таго, як мы ў сацыяльным кірунку развіваемся, з'яўляецца дапамога па доглядзе дзіцяці. З самага пачатку гэта былі нязначныя сумы, а цяпер гэты паказчык прывязаны да сярэдняй зарплаты па краіне. Вялікую ролю ў ацэнцы сацыяльнага развіцця адыгрываюць наша бясплатная адукацыя і медыцына.



**Міхаіл КАВАЛЁЎ, дэкан эканамічнага факультэта БДУ, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь:**

— Мне здаецца, што Беларусь павінна была заняць у гэтым рэйтынгу яшчэ вышэйшае месца, бо традыцыйна і адукацыя, і ахова здароўя ў нашай краіне ўваходзяць у трыццатку лепшых у свеце. Але ўсё роўна важна, што мы аказаліся даволі высока па паказчыках адукацыі, медыцыны, рэалізацыі чалавечага патэнцыялу. Адзначу, што па чалавечым патэнцыяле Беларусь займае 50-е месца ў свеце, згодна з вельмі вядомым рэйтынгам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

# «Звязду» цікава не толькі чытаць!..

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ён працуе пажарнікам, піша вершы, прозу, удзельнічаў у звяздоўскім конкурсе на лепшае апавяданне, кожны нумар газеты чытае ад першых радкоў да апошніх, — расказала Юлія Сямёнаўна.

У самой жа, як прызналася, забіраючы прыз, часу на чытанне бракуе, бо ў сям'і двое дзяцей. Сын, праўда, без пяці хвілін студэнт, а вось з дачушкай маці пакуль у так званым дэкрэтным.

Па прафесіі Юлія Сямёнаўна педагог, працуе ў школе, дзе, дарэчы, усе прадметы выкладаюцца па-беларуску, і ні дзеці, ні іх бацькі, ні настаўнікі анічога супраць не маюць. Адзінае, што асобным выпускнікам, як зазначыла наша падпісчыца, потым цяжкавата бывае паступаць, па-руску вучыцца далей…

Што да картак на розыгрыш прызоў, то сям'я Мішчукоў адсылала іх нячаста і нейкіх асаблівых спадзяванняў на выйгрыш не мела.

— А тут тэлефануе мой родны дзядзька з Мінска, — працягвае Юлія Сямёнаўна, — кажа: «Зайдзі на сайт «Звязды». Добрая навіна там ёсць…» Мы адразу ж туды… Паглядзелі, — атрымалася, што навін там дзве! І якія ж невераґодныя!.. Мы вельмі рады за нашага дзядзьку! Ды і за сябе…

У сям'і нашых маларыцкіх падпісчыкаў свой дом. Так што траву (і самай звычайнай дзедаўскай касой) гаспадар касіў часта. Гэты працэс, як прызналася жонка, яму падабаўся. Праўда, сіл вымагаў… Ды і часу займаў нямала…

Так што цяпер змагацца з травой будзе намнога прасцей.

— Мы ў бліжэйшы час такую рэч купляць не збіраліся, — прызналася Юлія Сямёнаўна. — Так што дзякуй газеце! Яе, як высвятляецца, цікава не толькі чытаць, — з ёй і выйграваць яшчэ можна!

**Валянціна ДОЎНАР.**

# СВАЮ ДАЧУ ВЯЗУ З САБОЙ

**У пачатку жніўня пройдзе першы рэспубліканскі турысцка-спартыўны злёт караванераў.**

Мяркуецца, што базай для стаянкі дамоў на колах стане бераг возера Сялява каля аграгарадка Калодніца, што ў Крупскім раёне Мінскай вобласці. Нядаўна там адкрыўся новы кемпінг, здольны прыняць адначасова больш за 300 чалавек.

У кемпінгу ёсць гасцявыя двух-і чатырохмесныя домікі, адна- і двухпавярховыя кемпінгавыя палаткі, а таксама 50 месцаў для аўтадромаў і жылых турыстычных аўтапрычэпаў, 50 месцаў для палатак.

Абсталяваны тут дзіцячая і спартыўная пляцоўкі, месца для развядзення вогнішча, ёсць стаянка для аўтамабіляў, прычал.

Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства спорту і турызму, праграма злёту прадугледжвае дэманстрацыю магчымасцяў і прывабнасці такога віду падарожжаў і адпачынку, абмеркаванне актуальных праблем, абмен інфармацыяй і назапашаным вопытам, пошук шляхоў далейшага развіцця караванінгу ў краіне.

Падчас злёту пройдуць спартыўна-масавыя і культурна-забаўляльныя мерапрыемствы.

Нагадаем, у Беларусі сёння зарэгістравана каля 600 прычэпаў-дач і 40 аўтадамоў, функцыянуе 13 стаянак для кэмпераў.

У лютым гэтага года створана Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Беларускі клуб караванераў і аўтатурыстаў».

**«Мінск — Навіны».**

■ Беражыце сябе!

# Выпіў, пайшоў купацца... і атрымаў вянок пад жалобны марш

## МНС Беларусі запісала відэапамятку для нецвярозых купальшчыкаў

**Невялікі, усяго на 2 хвіліны, агітацыйны відэаролік, які з'явіўся на афіцыйным канале Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі на інтэрнэт-сервісе YouTube, меў ашаламляльны поспех і эфект бомбы. Менш чым за два дні відэа пад назвай «Вечная памяць нецвярозым купальшчыкам» паглядзелі звыш 170 тысяч чалавек.**

У сюжэце, знятым нядаўна на пляжы аднаго з мінскіх вадасховішчаў (Цнянскага), нецвярозага адпачывальніка, які, насуперак усім правілам бяспекі і здаровага сэнсу, пайшоў купацца, сустракаў вадалаз з вянком і духавы аркестр МНС у парадмай форме — з музыкай… Калі быць дакладнымі, з маршам Шапэна, больш вядомым як пахавальны. А супрацоўнікі АСВОДа, якія патрулявалі ўзбярэжжа на лодцы, разгарнулі транспарант з надпісам «Вечная памяць нецвярозым купальшчыкам». Напрыканцы аўтары роліка нагадалі: паводле статыстыкі, 8 з 10 патанулых знаходзіліся ў нецвярозым стане. Дарэчы, паводле апошніх звестак Беларускага рэспубліканскага таварыства выратавання на водах, толькі сёлета ў водасховішчах Беларусі патанулі 269 чалавек (пры тым, што амаль столькі ж, 268, удалося выратаваць). І хоць гэта на 28,7% менш, чым за аналагічны перыяд мінулага года, хутчэй за ўсё, да канца лета сумная лічба ахвяр вады павялічыцца…






Фота з афіцыйнага акаўнта МНС у Twitter.

Мабыць, таму, нягледзячы на чорны гумар відэароліка, крэатыўная распрацоўка Рэспубліканскага цэнтра прапаганды МНС сустрэла практычна аднагалосную падтрымку інтэрнэт-карыстальнікаў. «Сацыялка, вартая «Канскіх львоў», «Выдатна, дасціпна і дзейсна!», «Толькі так і можна дастукацца да нашых людзей, якім мора па калена» — такімі водгукамі выбухнулі ў адказ сацыяльныя сеткі і форумы, дзе абмяркоўваюць неардынарную памятку. І хоць лічаныя скептыкі мяркуюць, быццам ролік пастановачны, і ўсе дзейныя асобы — падстаўныя акцёры, агульнага захаплення ад ідэі гэта не змяншае.

«Мы стараемся працаваць з рознымі аўдыторыямі, у тым ліку і з моладдзю, — каментуе прэс-сакратар Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ. — Гэтае відэа адрасавана ў першую чаргу якраз маладым людзям, якія змогуць падзяліцца спасылкамі з сябрамі, «лайкнуць», «рэтвітнуць» — словам, усяляк распаўсюдзіць ролік. Але акрамя таго, што яны пасмяюцца з сюжэта, спадзяёмся, у іх галовах застанецца асноўны пасыл, што ні ў якім выпадку нельга ўваходзіць у ваду ў нецвярозым стане». Дарэчы, як удалося высветліць «Звяздзе», нашумелы ролік — плод сумеснай творчасці міністэрства і рэкламнага агенцтва, якое падтрымала гэты цалкам некамерцыйны праект.

### *Між іншым*

Гэта не першая падобная распрацоўка беларускіх выратавальнікаў. Параўнальна нядаўна шырокі пазітыўны рэзананс выклікала крэатыўная сацыяльная рэклама — плакаты з жабкай і божымі кароўкамі, якія «не ідуць у ваду выпіўшымі» і «не паляць у ложку».

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# «ПАД СПАЙСАМ» ВЫКАЛАЛІ СЯБРУ ВОЧЫ

**Новая трагедыя, звязаная з ужываннем спайсу, здарылася на гэтым тыдні ў Гомелі па вуліцы Дакутовіча, адкуль бліжэй да поўначы ў міліцыю паступіў званок-скарга на неадэкватныя паводзіны маладых мужчын. Заяўлялася, што тыя галышом бегаюць па двары суседняга дома і моцна шумяць.**

Калі аператыўнікі прыбылі на месца, то ў адным з пакояў дома ў прыватным сектары знайшлі хлопца (1991 г. н.), у якога былі выдалены абодва вокі, а нос, шчака і вушы былі моцна пашкоджаны вострым прадметам. Побач на ложку знаходзіліся яшчэ двое хлопцаў (1985 і 1993 г. н.). Пацярпелы быў дастаўлены ў бліжэйшую медустанову, яго «сябры» — у райаддзел міліцыі.

Як паведамляюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, маладыя людзі сустрэліся ў панядзелак вечарам, каб набыць разам спайс і ўжыць яго. Ужыванне скончылася тым, што цяпер па факце нанясення цяжкіх цялесных пашкоджанняў заведзена крымінальная справа.

Міністэрства ўнутраных спраў зноў нагадвае, што курыльныя сумесі, якія рэкламуюцца як бяспечныя, на самой справе з'яўляюцца вельмі небяспечнымі рэчывамі. Нават аднаразовае ўжыванне прыводзіць да імгненнага парушэння псіхікі, незваротных пашкоджанняў цэнтральнай нервовай сістэмы. Усё часцей выпадкі перадазіровак падчас ужывання спайсаў заканчваюцца лятальным зыходам. За паўгода ў медустановах у сувязі з перадазіроўкай зарэгістравана 566 выпадкаў, 9 завяршыліся смерцю. У абсалютнай большасці размова ідзе пра няпоўнагадовых.

Паняцця легальных курыльных сумесяў (спайсаў) у нашай краіне не існуе. Любыя дзеянні з забароненымі псіхатропнымі рэчывамі могуць пацягнуць за сабой крымінальную адказнасць — пазбаўленне волі тэрмінам да 15 гадоў.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

■ Здаровы ўраджай

# ЧАГО БАЯЦЦА КАЛАРАДСКІЯ ЖУКІ?

## АД «ХІМІІ» ЯНЫ НЕ ГІНУЦЬ

**Высокія тэмпературы, дажджы і павышаная вільготнасць паветра спрыяюць розным захворванням бульбы і павелічэнню колькасці каларадскіх жукоў. Якім чынам лепш вылечыць бульбу і пазбавіцца ад шкодных насякомых, якіх сёлета і праўда шмат, распавёў загадчык аддзела імуналогіі і аховы бульбы Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па бульбаводстве і агародніцтве Іван БУСЬКО.**

«Супраць каларадскага жука прымяняюць як біялагічныя, так і хімічныя сродкі абароны — інсектыцыды, — гаворыць спецыяліст. — Самае простае, што можна зрабіць — стрэсці жукоў, сабраць іх і знішчыць. Што датычыцца прымянення «хіміі», то трэба памятаць: апрацоўваць можна толькі лічынак каларадскага жука. Чаму так? Дарослыя казуркі маюць жорсткую абалонку, і як толькі адчуваюць небяспечныя для сябе рэчывы, упадаюць у спячку, а праз нейкі час «прачынаюцца» і зноў шкодзяць. Па гэтай прычыне дарослых жукоў можна толькі збіраць. Самая ўразлівая фаза лічынак, калі яны памерам крыху большыя за запалкавую галоўку. Найбольш эфектыўная практыка барацьбы з каларадскім жуком — прымяненне інсектыцыдаў менавіта ў такім узросце лічынак. Можна выкарыстоўваць якасны прэпарат: «Інта — вір» — 1 таблетку разводзяць у 10 літрах вады. Таксама добра дапамагаюць «Актара», «Маспілан».

Іншыя хваробы, якія развіваюцца на бульбе ў гарачы сезон — заражэнне грыбковымі спорамі: фітафтароз і альтэрнарыёз, альбо ранняя сухая плямістасць. Для барацьбы з імі варта выкарыстоўваць фунгіцыды — сродкі, накіраваныя на барацьбу з грыбковымі захворваннямі.

«Пры выбары хімічных сродкаў варта памятаць, што ёсць сістэмныя прэпараты і кантактныя, — адзначыў Іван Бусько. — Першыя, трапляючы, напрыклад, на ліст, убіраюцца ўнутр расліны і абараняюць яе ўсю прыкладна да 12–14 дзён. Магу параіць «Акрабат», «Рыдаміл». Кантактныя «лекі» дзейнічаюць нядоўга, бо змываюцца дажджом, таму працэдуру «лячэння» давядзецца паўтараць. Гэта такія сродкі, як «Дзітан-М-45» альбо «Азафос».

**Кацярына РАДЗЮК**

■

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 6 (35)

■ З першых вуснаў

# САЛДАЦКІЯ КІЛАКАЛОРЫІ

## У харчовы паёк дадалі садавіну, тварог і яшчэ адну булачку

**Сёлета ў рацыёне вайскоўцаў адбылася своеасаблівая «рэвалюцыя»: змяніліся нормы харчовых пайкоў. Якасць салдацкага харчавання асабіста ацаніў і Аляксандр Лукашэнка. Падчас наведвання 103-й гвардзейскай асобнай мабільнай брыгады Прэзідэнт краіны пабываў у сталовай, дзе харчуюцца прадстаўнікі элітных войскаў, і нават пакаштаваў сухія пайкі і кансервы, якія складаюць новы рацыён абаронцаў Айчыны.**

**Харчаванне ў арміі заўсёды хвалявала шырокую грамадскасць. Асабліва перажываюць на гэты конт бацькі, адпраўляючы сваіх сыноў у войска. І нават вядомае «служба службай, а абед па раскладзе» не супакойвае іх. Вось і дарэмна. Трэба сказаць, што харчаванне салдат увесь час паляпшаецца: больш каларыйным становіцца рацыён, удасканальваюцца харчовыя нормы, уводзяцца новыя прадукты. Толькі на карысць вайскоўцам пайшлі і апошнія змены ў харчовых пайках. Што новага з'явілася ў салдацкім рацыёне і як разлічваюцца такія патрэбныя армейцам калорыі, расказаў начальнік харчовага ўпраўлення Міністэрства абароны Беларусі палкоўнік Аляксандр ГАРДЗЮНІН.**



***— Аляксандр Вячаслававіч, нядаўна былі зменены нормы харчовых пайкоў вайскоўцаў. З чым гэта звязана?***

— Развіццё і ўдасканаленне сістэмы харчовага забеспячэння Узброеных Сіл непарыўна звязана з пераўтварэннямі, якія адбываюцца ў дзяржаве і беларускай арміі. Роля харчовага пытання ў агульнай сістэме тылавога забеспячэння войскаў няўхільна ўзрастае. На этапе якаснага ўдасканалення гэтай сістэмы захаваны назапашаны вопыт працы, ацэнены агульны стан, вызначаны галоўныя кірункі яго развіцця на сярэднетэрміновую перспектыву з улікам усіх умоў і фактараў, якія ўплываюць на якасць выканання мерапрыемстваў.

Змена нормаў салдацкіх пайкоў стала магчымай дзякуючы паляпшэнню эканамічнай сітуацыі, новым дасягненням у развіцці харчовай прамысловасці. З'явіліся новыя прадукты харчавання, павялічыліся тэрміны іх захоўвання, удасканалілася ўпакоўка прадуктаў. Перш чым унесці змены ў нормы пайкоў, быў праведзены дэталёвы аналіз арганізацыі харчавання вайскоўцаў у розных абставінах: як у стацыянарных сталовых, якія размяшчаюцца на базе воінскіх часцей, так і ў палявых умовах, падчас руху ў чыгуначных эшалонах і іншых месцах.

***— Ці часта і чаму мяняюцца нормы харчовых пайкоў?***

— Арганізацыя якаснага харчавання асабовага складу спрыяе ўмацаванню здароўя і фізічнаму развіццю вайскоўцаў, павышае ўстойлівасць арганізма да розных нагрузак і ў значнай ступені станоўча ўплывае на баявую гатоўнасць войскаў. Фізіялагічныя нормы харчавання для розных груп ваеннаслужачых заснаваны на дэталёвым вывучэнні абмену рэчываў, энергазатрат і ўліку патрэб чалавека ў бялках, ліпідах, вугляводах, вітамінах і мінеральных рэчывах. У іх знайшлі рэальнае ўвасабленне прынцыпы збалансаванага харчавання. Але варта адзначыць, што фізіялагічныя нормы харчавання нельга разглядаць як пастаянныя і нязменныя велічыні. Неабходнасць удасканалення іх абумоўлена, перш за ўсё, зменай характару працы і побыту, удакладненнем навуковых звестак аб харчаванні, змяненнем яго структуры і эканамічных рэсурсаў, а таксама эканамічных магчымасцяў.

***— А хто вырашае, колькі і чаго патрэбна з'есці салдату, каб быць у форме?***

— Над гэтым пытаннем працуюць харчовая і медыцынская службы Узброеных Сіл у цесным узаемадзеянні са спецыялістамі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра гігіены

**Харчаванне салдат паляпшаецца: больш каларыйным становіцца рацыён, удасканальваюцца харчовыя нормы, уводзяцца новыя прадукты.**

Міністэрства аховы здароўя. Перад зацвярджэннем нормы харчовых пайкоў узгадняюцца з міністэрствамі фінансаў, эканомікі і аховы здароўя.

Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр гігіены Міністэрства аховы здароўя даў заключэнне прадстаўленых харчовым упраўленнем Міністэрства абароны праектаў нормаў харчовых пайкоў для розных катэгорый вайскоўцаў. Гэтыя рэкамендацыі мы прынялі да ведама пры распрацоўцы новых харчовых рацыёнаў, па кожным з якіх было зроблена абгрунтаванае заключэнне. І ўжо з ліпеня гэтага года асобныя нормы харчовых пайкоў (агульнавайсковы, лячэбны і сувораўскі) зведалі змены з улікам рэкамендацый.

***— Што ўяўляе сабой сутачны рацыён харчавання звычайнага салдата згодна з апошнімі новаўвядзеннямі?***

— Перш за ўсё неабходна даць дакладнае паняцце харчовага пайка. Гэта пэўны асартымент і колькасць харчовых прадуктаў, якія выдаюцца за суткі аднаму чалавеку. Таму норму пайка зацвярджаюць адзіную і на працяглы час. А вось страў, якія гатуюцца з набору прадуктаў па дадзеным пайку, можна прыгатаваць колькі заўгодна.

Такім чынам, за суткі ваеннаслужачы спажывае 250 грамаў жытняга і 70 грамаў пшанічнага хлеба, 110 грамаў розных круп і 35 — макаронных вырабаў. Замест адной булачкі ў дзень салдату прапануецца дзве: на сняданак і вячэру. Бялок штодзённа вайсковец атрымлівае са 100 г мяса, дапоўненых 100 г мяса птушкі, 100 г рыбы, 30 г сметанковага масла, 100 г малака і кефіру, 30 г смятаны і тварагу. Дарэчы, апошняга раней не было. Акрамя таго, у сутачны рацыён беларускага ваеннаслужачага ўваходзяць адно яйка і 15 г сыру, 60 г цукру, 30 г канцэнтрату кісялю, а таксама мука, соль, перац, гарчыца, воцат, алей, лаўровы ліст, таматная паста, чай і сухафрукты для кампотаў.

***— А ці ўжываюць вайскоўцы вітаміны?***

— Крыніца вітамінаў — агародніна, садавіна і сокі, якія, безумоўна, уключаны ў рацыён ваеннаслужачых. У дзень яны ўжываюць па 830 грамаў агародніны (было 750): 550 г бульбы, 90 капусты, па 40 г буракоў і морквы, 60 г цыбулі, 40 г іншай агародніны, 5 г зяленіва. Агародніна дапаўняецца 100 грамамі розных сокаў. Дарэчы, цяпер ужо ім выдаецца і садавіна. Акрамя таго, вайскоўцы ўжываюць полівітаміны. Адбываецца гэта на працягу двух месяцаў з перапынкам на адзін месяц: студзень — люты, красавік — май, ліпень — жнівень, кастрычнік — лістапад.

***— Ці можна сказаць, што новы паёк па каларыйнасці пераўзыходзіць папярэдні?***

— Яна павысілася на 112 кілакалорый і складае 3524 кілакалорыі за суткі. Менавіта столькі патрэбна салдату для нармальнай жыццядзейнасці.

***— Лётны паёк заўсёды адрозніваўся ад агульнавайсковага. Да якіх змен у харчаванні даводзіцца прывыкаць лётчыкам?***

— А вось што тычыцца харчавання прадстаўнікоў авіяцыі, то тут ніякіх змен не адбылося. Нязначныя змены пацярпелі і суворaўскі, і бартавы паёк.

***— А што ўяўляе сабой лячэбны паёк? Ён складаецца індывідуальна, у залежнасці ад хваробы?***

**Пры выяўленні адхіленняў ад пастаяннай масы цела прымаецца рашэнне аб выдачы дадатковага харчавання.**

— Сутнасць лячэбнага харчавання заключаецца ў падборы пэўных прадуктаў, спосабаў іх кулінарнай апрацоўкі і выбары страў, якія аказваюць станоўчы ўплыў на дзейнасць асобных органаў і тканак хворага, узмацняючы або паслабляючы біялагічныя працэсы ў іх. Спецыяльнае харчаванне аказвае істотны ўплыў і на памяншэнне хваравітых працэсаў, якія адбываюцца ў арганізме. У некаторых выпадках яно становіцца адным з асноўных сродкаў лячэння, у іншых — выкарыстоўваецца як сродак, які спрыяе паспяховаму ажыццяўленню іншых метадаў лячэння. Лячэбнае харчаванне ажыццяўляецца ў адпаведнасці з пералікам стандартных дыет. Яго прызначае ўрач у залежнасці ад характару і стадыі захворвання.

***— І ўсё ж харчаванне — справа індывідуальная. Як разлічыць нормы пайкоў так, каб і галодным не застацца, але і пазбегнуць пераядання?***

— Вайскоўцы падчас праходжання службы ў шэрагах Узброеных Сіл увесь час знаходзяцца пад наглядам спецыялістаў медыцынскай службы. Пры выяўленні адхіленняў ад пастаяннай масы цела прымаецца рашэнне аб выдачы дадатковага харчавання. Ваеннаслужачым, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу, курсантам ваенных навучальных устаноў, суворaўцам і выхаванцам дазваляецца выдаваць дадатковае харчаванне ў памеры паловы прадугледжаных для іх харчовых пайкоў. Гэта тычыцца юнакоў ростам больш як 190 сантыметраў і вышэйшых. У такім выпадку дадатковае харчаванне ім прадастаўляецца на ўвесь тэрмін вайсковай службы або перыяд навучання. А тым, хто мае недастатковую масу цела, — тэрмінам на 3 месяцы. Дадатковае харчаванне прызначаецца па загадзе камандзіра вайсковай часці на падставе заключэння ваенна-ўрачэбнай камісіі.

***— Існуе думка, што рэзкае памяншэнне вагі вайскоўцаў звязана з рэжымным харчаваннем...***

— Я не магу з гэтым пагадзіцца. Наадварот, вопыт паказвае, што, прыйшоўшы ў войска, юнакі ў першыя месяцы службы набіраюць пару-тройку кілаграмаў. Строгі распарадак дня, рэжым харчавання, каларыйная і пажыўная ежа — усё гэта дазваляе не дапусціць змяншэння вагі.

Галоўнае для нас — не толькі згодна з распарадкам дня накарміць асабовы склад з таго асартыменту прадуктаў, якія адпавядаюць нормам, а і дамагчыся, каб своечасова прыгатаваная ежа была збалансаванай, высакаякаснай і разнастайнай, а порцыі — паўнаважкімі. Патрабаванні нескладаныя, але выконваца яны павінны. У першую чаргу, непасрэдна ў вайсковых часцях спецыялістамі харчовай службы на аснове высокага прафесіяналізму, глыбокай асабістай адказнасці і разумнай ініцыятывы.

**Вераніка КАНЮТА**



Адзін з любімых момантаў у вайскоўцаў — паход у сталоўку.

Фота Надзеі БУЖАН.

**УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ № 364**

## Аб звальненні ў запас ваеннаслужачых тэрміновай ваеннай службы і рэзервістаў і прызыве грамадзян на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве ў жніўні—лістападзе 2014 г.

*(Вынятка)*

1. Звольніць у запас ваеннаслужачых тэрміновай ваеннай службы і рэзервістаў, якія выслужылі ўстаноўленыя тэрміны ваеннай службы па прызыве, службы ў рэзерве.

2. Прызваць у жніўні—лістападзе 2014 г. на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве грамадзян Рэспублікі Беларусь мужчынскага полу, якім на дзень прызыву споўнілася 18 гадоў і якія не маюць права на адтэрміноўку ад прызыву, а таксама грамадзян прызыўнога ўзросту, што страцілі права на адтэрміноўку.

3. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму забяспечыць выкананне мерапрыемстваў, звязаных з прызывам грамадзян на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

4. Міністэрству абароны да 1 снежня 2014 г. накіраваць грамадзян, прызваных на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, ва Узброеныя Сілы, іншыя войскі і воінскія фарміраванні Рэспублікі Беларусь у межах колькасці згодна з дадаткам*.

5. Устанавіць, што пацярпелыя ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС грамадзяне, прызваныя на тэрміновую ваенную службу, накіроўваюцца ў воінскія часці і фарміраванні, якія знаходзяцца не на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання, назначаюцца на воінскія пасады, не звязаныя з работамі па эксплуатацыі крыніц іанізуючага выпрамянення, звышвысокіх частот і з кампанентамі ракетнага паліва.

6. Дзяржаўнаму аб'яднанню «Беларуская чыгунка» забяспечыць па заяўках Міністэрства абароны, іншых дзяржаўных органаў, у якіх прадугледжана ваенная служба, перавозку ваеннаслужачых тэрміновай ваеннай службы і рэзервістаў, якія выслужылі ўстаноўленыя тэрміны ваеннай службы па прызыве, службы ў рэзерве, і грамадзян, прызваных на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве.

7. Ваенным камісарам на падставе адпаведных рашэнняў раённых (гарадскіх) прызыўных камісій накіроўваць у органы пракуратуры матэрыялы на грамадзян, якія ўхіліліся ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, для прыцягнення іх да адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

8. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь да 20 студзеня 2015 г. прадставіць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь інфармацыю аб выніках прызыву грамадзян на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве.

9. Гэты Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА**

*21 ліпеня 2014 г.
г. Мінск.*

*Дадатак — для службовага карыстання.

# НА «АРЭНЕ» — «ГРЫФ»!

## Сёлетняя ваенная выстава аказалася даволі паспяховай — было заключана пагадненняў амаль на 700 мільёнаў долараў



Выстава была цікавай не толькі для спецыялістаў.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Выстава ўзбраення і ваеннай тэхнікі MILEX-2014 сёлета праводзілася ўжо сёмы раз. Арганізатары стварылі ўсе ўмовы для таго, каб экспазіцыя была цікавай не толькі спецыялістам і аматарам зброі, але і людзям, якія вайсковай тэматыкай ніколі не захапляліся.**

Напэўна, галоўнае, што адрознівала сёлетняе мерапрыемства ад іншых падобных яму, — скіраванасць не толькі на людзей, праца якіх непасрэдна звязана з узбраеннем, але і на непадрыхтаваную публіку. Пра гэта сведчыла і месца, якое было выбрана для правядзення выставы сёлета — культурна-спартыўны комплекс «Мінск-Арэна» выдатна падыходзіў для мерапрыемства такога маштабу. Вялікая частка экспазіцыі размяшчалася пад дахам канькабежнага стадыёна (у выглядзе стэндаў асобных прадпрыемстваў), а самыя буйныя экспанаты выстаўляліся на пляцоўцы пад адкрытым небам.

На выставачнай пляцоўцы былі размешчаны стэнды вытворцаў вайсковай тэхнікі з Італіі, Кітая, Расіі, Украіны. Але пераважала, безумоўна, беларуская частка экспазіцыі.

Абмяркоўвалі найперш новыя распрацоўкі беларускіх вытворцаў. Напрыклад, першы беларускі беспілотнік «Грыф-1». Яго стварэннем займалася адразу некалькі айчынных кампаній, а галоўнай асаблівасцю з'яўляецца тое, што пры стварэнні амаль не выкарыстоўваліся імпартныя дэталі. Праца над беспілотнікам вялася на працягу трох гадоў, але вынік не можа не ўражваць: радыус дзеяння — 100 кіламетраў, працягласць палёту — да 5 гадзін, маса карыснай нагрузкі — да 20 кілаграмаў. «Грыф-1» зможа працаваць нават пры адсутнасці спадарожнікавага навігацыйнага сігналу. Першыя пробныя палёты апарат прайшоў паспяхова: узлёт, рух па маршруце і пасадка былі праведзены ў поўнасцю аўтаматычным рэжыме. Паводле слоў **генеральнага дырэктара кампаніі «АГАТ Сістэмы кіравання» Юрыя МАСІЕНКІ,** у серыйную вытворчасць «Грыф-1» пойдзе на пачатку 2015 года. На гэты перыяд запланаваны і першыя пастаўкі апарата для Узброеных Сіл Беларусі. Кошт беспілотніка складае каля 2 мільёнаў долараў, але вытворцы плануюць зменшыць яго ўдвая дзякуючы арганізацыі серыйнай вытворчасці.

Акрамя ўласна айчынных распрацовак, на выставе былі прадстаўлены і беларускія мадыфікацыі ўжо існуючай тэхнікі. Той жа зенітна-ракетны комплекс С-125 «Пячора», мадэрнізаваны ў Беларусі да ўзроўню С-125-2БМ. Праект па мадэрнізацыі комплексу, створанага яшчэ ў СССР у канцы 1950-х, атрымаў назву «Алебарда». У выніку характарыстыкі зброі значна палепшыліся: далёкасць паражэння вырасла з 24,8 да 30 кіламетраў, вышыня — з 18 да 20 кіламетраў, максімальная хуткасць дасягнення цэлі — з 700 да 800 метраў за секунду, верагоднасць паражэння цэлі адной ракетай — з 70 да 90 працэнтаў. С-125 разгортваецца за паўтары гадзіны, беларуская мадыфікацыя — за 30 хвілін.

Акрамя забеспячэння ўласнай бяспекі, такая праца беларускага ваенпрама, безумоўна, важная і для дзяржбюджэту. Беларусь прадае зброю ў 60 краінах свету. Большасць пакупнікоў — з Афрыкі, Лацінскай Амерыкі, Паўднёва-Усходняй Азіі. Менавіта плённая праца ваенна-прамысловага комплексу дазваляе Беларусі канкурыраваць з такімі гігантамі рынку зброі, як ЗША, Расія, Германія...

Галоўнае, што трэба заўважыць, — распрацоўкі беларускіх ваенных інжынераў могуць прымяняцца ў мірным жыцці. Так, усё тыя ж беспілотнікі могуць і будуць выкарыстоўвацца для патрулявання дзяржаўнай мяжы, экалагічнага маніторынгу і іншых мэтаў.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ**

■ Спаборніцтва асаў

# Авіядартс — справа тонкая

## Міжнародны авіячэмпіянат з удзелам беларусаў у гэтыя дні праходзіць у Расійскай Федэрацыі

**На працягу некалькіх дзён паветраныя асы з Расіі, Беларусі і Кітая паспаборнічаюць у сваім майстэрстве на вайсковых аэрадромах Варонежа і Ліпецка. Нашу краіну прадстаўляе лётны экіпаж 116-й гвардзейскай штурмавой авіябазы, якая дыслакуецца ў Лідзе.**

Конкурс баявой вывучкі лепшых лётных экіпажаў ваенна-паветраных сіл стартаваў другі год запар. Спачатку спаборніцтвы вяліся паміж расійскімі авіятарамі, але сёлета конкурс набыў міжнароднае гучанне. Прыемна, што сярод удзельнікаў — і беларусы. Якім чынам яны рыхтаваліся да авіячэмпіянату, удалося даведацца напярэдадні.



Лідскую авіяцыйную часць прадстаўляюць тры вайскоўцы. Гэта парны экіпаж самалётаў «Су-25» у складзе лётчыка 1-га класа гвардыі маёра Андрэя Лакусты і лётчыка 2-га класа гвардыі маёра Аляксандра Койпаша. Запасны канкурсант — лётчык 1-га класа гвардыі маёр Мікалай Смалянінаў.

— Не памылюся, калі скажу, што гэтыя лётчыкі з'яўляюцца аднымі з лепшых авіятараў краіны, — перакананы **намеснік камандзіра 116-й гвардзейскай штурмавой авіябазы па ідэалагічнай рабоце гвардыі падпалкоўнік Андрэй ХРАПТОВІЧ.** — Усе яны маюць высокія званні, адпаведныя катэгорыі і, у першую чаргу, выдатны ўзровень натрэніраванасці. Безумоўна, яны — вопытныя прафесіяналы, майстры сваёй справы. Усе трое неаднойчы ўдзельнічалі ў парадзе, які рэгулярна праходзіць у беларускай сталіцы. Не стаў выключэннем і гэты год: у небе над Мінскам праляцелі і лідскія лётчыкі, якія сёння прадстаўляюць Беларусь на міжнародных спаборніцтвах.

Праўда, спачатку іх чакалі сур'ёзныя трэніроўкі. У тыя перадконкурсныя дні лідскі аэрадром літаральна стаў пляцоўкай для авіяшоу. Паветраныя асы адпрацоўвалі фігуры вышэйшага пілатажу, найскладанейшыя манеўры. Але галоўная задача авіядартса — паказаць не толькі майстэрства лётнага складу, а і яго баявыя магчымасці.

Конкурс праходзіць у два этапы. На першым лётчыкі спаборнічаюць у тэхніцы пілатавання і разведцы, на другім — у баявым прымяненні. Праўда, перад тым, як прыступіць да выканання задач, беларусы, як і астатнія ўдзельнікі авіячэмпіянату, ужо на месцы прайшлі падрыхтоўчы перыяд. Лётчыкі здалі нарматывы па фізічнай падрыхтоўцы, ажыццявілі папярэдні палёт па маршруце, нават паспелі патрэніравацца.

— Галоўная задача кожнага экіпажа — пераадолець усе магчымыя перашкоды і знайсці сваю цэль на зямлі, — расказаў **лётчык 2-га класа двойчы гвардыі маёр Аляксандр КОЙПАШ.** — Мішэні размесцяцца на палігоне. Будзе ацэньвацца дакладнае трапанне ў цэль з ракетных установак і авіяцыйных гармат. Вельмі важна тут і ўмець весці разведку. Гэта падобна на паказальныя выступленні лётчыкаў з баявой стральбой па мішэнях. Толькі ўмовы больш набліжаныя да рэальных. Адным словам, падчас авіядартса мы павінны паказаць не толькі комплекс навыкаў беларускіх лётчыкаў па вядзенні баявых дзеянняў у розных абставінах, а і ўзровень нашай прафесійнай падрыхтоўкі.

А гэта якраз ацэняць суддзі. Дарэчы, сярод іх — і міжнародныя арбітры. Пераможцы вызначацца ў выніку падсумавання балаў, атрыманых падчас праходжання ўсіх конкурсных этапаў. Спадзяёмся на высокія балы нашай каманды і зычым лётчыкам чыстага неба!

**Вераніка КАНЮТА**

■ Сустрэчы патрыётаў

# ...І, БЕЗУМОЎНА, — «ЗАРНІЦА»!

## Чарговы раз рэспубліканскі злёт абаронча-спартыўнага профілю сабраў школьнікаў з усёй краіны

**Для навучэнцаў ваенна-патрыятычных і кадэцкіх класаў, а таксама членаў аб'яднанняў ваенна-патрыятычнай накіраванасці лета — гэта не толькі канікулы, але яшчэ і час прадэманстраваць добрае веданне агульнаадукацыйных дысцыплін, паказаць фізічную падрыхтоўку і праявіць баявы камандны дух.**

Такую магчымасць штогод школьнікам прадстаўляюць міністэрствы абароны і адукацыі. У злёце прымае ўдзел больш за сотню чалавек — мінскія навучэнцы і школьнікі з усіх абласцей краіны.

— Рэспубліканскі злёт абаронча-спартыўнага профілю з кожным годам карыстаецца ўсё большай папулярнасцю сярод дзяцей, — расказала **адна з арганізатараў злёту, намеснік дырэктара Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства Лідзія ЖУР.** — У сувязі з пэўнымі зменамі ў адукацыі ў некаторых установах не стала ваенна-патрыятычных класаў, але, тым не менш, ваенна-патрыятычны рух у школах працягвае існаваць у выглядзе клубаў, аб'яднанняў, гурткоў. Дзеці з задавальненнем не толькі займаюцца спартыўнай падрыхтоўкай, але праводзяць невялікія даследаванні. Іх цікавяць падзеі як Першай сусветнай вайны, так і Вялікай Айчыннай.



Школьнікі адточваюць страявую.

Сімвалічна, што сёлетні злёт прымеркаваны да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Адсюль і больш шырокая праграма, якая чакала юнакоў і дзяўчат на працягу некалькіх дзён. Падлеткі наведалі ваенныя навучальныя ўстановы, памятныя і гістарычныя месцы, пазнаёміліся са звычайным жыццём беларускіх вайскоўцаў, убачылі ўзбраенне і ваенную тэхніку, якой валодае сучасная армія.

Не абышоўся злёт і без ваенна-спартыўнай гульні «Зарніца», якую так палюбілі школьнікі. Да кожнага з этапаў спаборніцтва навучэнцы рыхтаваліся загадзя: адпрацоўвалі страявую, вучыліся скакаць праз умоўныя акопы, пераадольваць паласу перашкод і лабірынт, «размініраваць» участак мясцовасці, праводзіць зборку-разборку аўтамата, кідаць гранаты, аказваць першую медыцынскую дапамогу...

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

■ Канікулы колеру хакі

# ШКОЛА ЖЫЦЦЯ І МУЖНАСЦІ



## Як выхоўваюць цяжкіх падлеткаў у печынскай «вучэбцы»?

**Кожнае лета на базе вучэбнага цэнтра ў Барысаве традыцыйна арганізуецца летні адпачынак школьнікаў. Як паказвае практыка, армія з'яўляецца любімым месцам для падлеткаў, дзе можна цікава і з карысцю правесці канікулы. Многія з вялікім жаданнем прыязджаюць сюды штогод, сталеючы разам з лагерам, сустракаючыся са старымі сябрамі і выхавальнікамі. Не стаў выключэннем і цяперашні летні сезон. На базе 114-й гвардзейскай школы па падрыхтоўцы прапаршчыкаў і спецыялістаў харчовай службы для школьнікаў адкрыты двухзменны спартыўна-патрыятычны летнік «Абаронца Айчыны» кругласутачнага знаходжання.**

Кантынгент у лагеры асаблівы: падлеткі ад 7 да 15 гадоў з няпоўных, шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў, а таксама прыёмныя дзеці. Дванаццаць з іх знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, сямёра — на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх. Многія падлеткі, якія патрабуюць павышанай увагі, накіраваны сюды на перавыхаванне сацыяльнымі педагогамі.

### НЕ РАБОТА — СЯМ'Я

У першай змене шэсцьдзясят шчаслiўчыкаў атрымалі магчымасць не толькі добра адпачыць у сценах «вучэбкі», але і падужэць фізічна, пазнаёміцца з рэаліямі армейскага жыцця, спазнаць цану сапраўднага мужчынскага сяброўства, паспаць на салдацкім ложку і нават пагуляць у «вайнушку». А самае галоўнае тое, што тут яны ўвесь дзень знаходзяцца пад наглядам і пастаянна занятыя справай.

Камандаванне школы, якой **кіруе гвардыі падпалкоўнік Уладзімір БАРАНСКІ**, з разуменнем паставілася да такой важнай, хоць і турботнай, справы. І перш за ўсё таму, што бачыць у ёй прамую карысць для арміі і грамадства ў цэлым. Бо, па вялікім рахунку, многія з гэтых юнакоў у свой час стануць салдатамі. Магчыма, хтосьці з іх будзе праходзіць тэрміновую ваенную службу ў гэтым жа вучэбным злучэнні. Але гэта будзе потым. А пакуль печынская «вучэбка» стала асноўным прытулкам, дзе падлеткам змогуць прывіць густ да нармальнага жыцця.

— У праграму мерапрыемстваў традыцыйна ўключылі правядзенне шэрагу азнаямленчых заняткаў па розных ваенных дысцыплінах, — адзначыў **вядучы спецыяліст аддзялення ідэалагічнай работы вучэбнага цэнтра падпалкоўнік запасу Ігар ЧАЛЕНКА.** — Для працы са школьнікамі ў дапамогу адміністрацыі лагера падабралі інструктарскі склад з ліку вопытных прафесіяналаў у пагонах. Афіцэры і ваеннаслужачыя па кантракце практычна штодня праводзяць з юнакамі не толькі запланаваныя вучэбныя заняткі па страявой, агнявой, інжынернай, ваенна-медыцынскай падрыхтоўцы, але і дапамагаюць выхавальнікам арганізоўваць спартыўныя спаборніцтвы і ваенізаваныя эстафеты, конкурсы і інтэлектуальныя гульні, гутаркі і віктарыны па ваенна-патрыятычнай тэматыцы. Словам, людзі ў пагонах робяць усё магчымае, каб у армейскай абстаноўцы падлеткі не толькі добра адпачылі, але і атрымалі пэўныя веды і навыкі, якія абавязкова спатрэбяцца ім у жыцці.



Чарговы раз узначаліў летнік «Абаронца Айчыны» выкладчык фізічнай культуры і здароўя сярэдняй школы № 24 горада Барысава маёр у адстаўцы Сяргей Глушанін. Па сумяшчальніцтве ён вядзе ў школьнікаў дапрызыўную падрыхтоўку. Дарэчы, Сяргей Канстанцінавіч — майстар спорту СССР па мнагаборстве. Вось ужо пяць гадоў запар вопытны настаўнік разам з памочнікамі-педагогамі ў летні сезон праводзіць час з падлеткамі з усяго раёна.

Для Сяргея Канстанцінавіча і яго паплечнікаў праца ў летніку — нешта накшталт хобі, або, калі хочаце, стыль жыцця. Тут не школа і не праца. Хутчэй сям'я, дзе галоўная задача — засцерагчы хлопцаў ад крыміналу, выкараніць у іх шкодныя звычкі, вярнуць іх да нармальнага ладу жыцця, навучыць іх парадку і дысцыпліне. Словам, дапамагчы кожнаму стаць чалавекам, грамадзянінам, патрыётам сваёй Радзімы.

— За кожнага маладога чалавека трэба змагацца, імкнучыся захапіць яго карысным для грамадства заняткам, развіць яго здольнасці, — лічыць Сяргей Глушанін. — Так, сярод нашых падапечных нямала падлеткаў з цяжкім лёсам, і характар у іх не цукар. Але ўсе яны дзеці, якіх можна і трэба паспець паставіць на правільны шлях.

### НЕ ГУЛЬНЯ — ЖЫЦЦЁ

Знаёмлюся з 10-гадовым Данілам Бутвілоўскім з сям'і, якая знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Кемлівы хлопец ужо чацвёрты год запар з вялікім жаданнем праводзіць частку летніх вакацый у гэтым лагеры.

— Мне ўсё ў арміі прыйшлося па душы, — прызнаўся Даніла. — Тут усё сапраўднае, ваеннае. У мяне ёсць свой узвод, камандзір і салдацкі ложак з тумбачкай. Сяржанты вучаць нас маршыраваць, разбіраць і збіраць сапраўдны аўтамат. А

**Армейская абстаноўка, у якой знаходзяцца падлеткі, вядома, адрозніваецца ад санаторнай. Але ў гэтым жа і заключаецца ўся прывабнасць адпачынку ў воінскай часці.**

яшчэ займаемся спортам, гуляем у настольны тэніс, футбол, шашкі.

Як расказала **намеснік начальніка лагера Ірына ЖАЛАБКОВІЧ,** адчуўшы на вучэбных занятках цікавасць да ваеннай навукі, пагутарыўшы з курсантамі школы прапаршчыкаў, большасць падлеткаў мяняецца ў лепшы бок на вачах, заваёўваючы сярод аднагодкаў сапраўдны, а не фальшывы дваровы аўтарытэт. Армейская абстаноўка, у якой знаходзяцца падлеткі, вядома, адрозніваецца ад санаторнай. Але ў гэтым жа і заключаецца ўся прывабнасць адпачынку ў воінскай часці.

Толькі першыя дні падлеткам нязвыкла было рана ўставаць, засцілаць за сабой ложак, прыбірацца. Не ўсім спачатку падабаецца ўмывацца з голым торсам, чысціць зубы, мыць шкарпэткі. Некаторыя нават спрабавалі класціся спаць у адзенні. Але з часам юнакі ўцягваюцца ў лагернае жыццё. Як паказвае практыка, многія з іх за 18 дзён так прывыкаюць, што просяцца потым пакінуць іх на другую змену.

Затое адразу ўсім адпачывальнікам спадабалася кухня. На дзяржаўную датацыю (у сярэднім 50 тысяч рублёў на чалавека ў дзень) у сталовай мясцовай школы № 7 арганізавана 5-разовае харчаванне з садавінай, малаком і выпечкай. Як паказвае практыка, за змену юнакі папраўляюцца на 4-5 кілаграмаў.

— Што тут утойваць, — заўважыў Сяргей Глушанін, — некаторыя такога багацця прадуктаў у сваёй сям'і і не бачылі...

Неабходна яшчэ адзначыць, што работа спартыўна-патрыятычнага летніка «Абаронца Айчыны» не абмяжоўваецца толькі ваеннай накіраванасцю. Для падлеткаў спланавана цікавая культурная праграма з наведваннем футбольнага матча любімай каманды БАТЭ на «Барысаў-Арэне», правядзеннем турыстычнага паходу ў рамках акцыі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся», наведваннем музеяў і гераічных месцаў Барысаўшчыны. Не забыліся арганізатары ўключыць у праграму і розныя конкурсы, гутаркі, кіналекторыі аб шкодзе алкаголю, курэння і наркотыкаў. Пад сваю апеку ўзялі падлеткаў спецыялісты сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай службы рэгіёна, актывісты БРСМ, настаяцель храма Дзмітрыя Данскога айцец Сергій. Пад пастаянным наглядам у органаў міліцыі знаходзяцца хлопцы, якія трапілі на ўлік у інспекцыю па справах непаўналетніх.

— Вы не паверыце, але ў гэтым летніку я ўжо сёмы раз запар, — прызнаўся 15-гадовы Леанід Белы, якому даверылі выконваць абавязкі намесніка камандзіра ўзвода. — Бавіць час у армейскай абстаноўцы мне вельмі падабаецца. Тут я пасталеў і многаму ўжо навучыўся. Умею камандаваць, укладваюся ў нарматывы па адзяванні ОЗК, разборцы і зборцы аўтамата. І з дысцыплінай у маім узводзе ўсё ў парадку. Абавязкова стану афіцэрам або на крайні выпадак кантрактнікам-дэсантнікам. Надта ж у іх форма прыгожая...

Дзіцячыя ўражанні — самыя моцныя і праўдзівыя. Для гэтых юнакоў, якія сёння з азартам ходзяць строем, з задавальненнем разбіраюць аўтамат, знаёмяцца з баявой тэхнікай і цікавяцца асновамі ваеннай навукі, салдацкія або афіцэрскія пагоны ніколі не будуць у цяжар. Для іх летні лагер стане сапраўднай школай мужнасці.

**Мікалай МАКАРЭВІЧ, фота аўтара.**

**На здымках:**

Падлеткі пад кіраўніцтвам сяржанта кантрактнай службы Андрэя САВІЦКАГА знаёмяцца з матэрыяльнай часткай аўтамата.

Заняткі па страявой падрыхтоўцы праводзіць малодшы сяржант кантрактнай службы Артур ГАЛУБ

■

■ Змена ідзе

# АРМІІ ЁСЦЬ НА КАГО РАЗЛІЧВАЦЬ

**Парад, крапавыя берэты і пасланне для будучага пакалення. Што трэба ведаць пра курсантаў і сёлетніх выпускнікоў Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь.**

1 Сярод выпускнікоў акадэміі — 18 залатых медалістаў, 12 з іх закончылі каманднa-штабны факультэт. Усяго да выпуску было прадстаўлена 80 афіцэраў (з іх дзве дзяўчыны: лейтэнанты Наіда Сапарава і Аляксандра Быліна) і 553 курсанты, а таксама 276 выпускнікоў вайсковых факультэтаў грамадзянскіх навучальных устаноў. Дыпломы з адзнакай атрымалі 27 чалавек. Каля 100 афіцэраў скончылі камандна-штабны факультэт акадэміі.

2 Дыпломы сёлета атрымалі і замежныя вайскоўцы. Бадай, самым зорным курсантам з іх аказаўся венесуэлец Гомэс Арся Хуан Хасэ — слухач камандна-штабнога факультэта, які скончыў сваю альма-матар з залатым медалём і навечна ўпісаў сваё прозвішча ў гісторыю акадэміі.

3 У сваю чаргу, у армейскай ВНУ краіны сёлета завяршылі навучанне 15 магістрантаў дзённай формы навучання і 25 — завочнай. Афіцэрам прысвоены ступені магістра ваенных, тэхнічных, педагагічных і псіхалагічных навук. Лепшыя магістарскія дысертацыі належаць старшым лейтэнантам Святлане Голубевай, Дзмітрыю Рахоцкаму і падпалкоўніку Яўгену Дземічаву.

4 Дарэчы, больш за палову ўдзельнікаў парада, прысвечанага Дню Незалежнасці, складалі афіцэры і курсанты Ваеннай акадэміі. Агулам дзевяць парадных разлікаў! У форме салдат Вялікай Айчыннай вайны ўрачыстым маршам прайшлі курсанты агульнавайсковага факультэта. У склад зводнага аркестра Міністэрства абароны былі ўключаны 13 фанфарыстаў — курсанты авіяцыйнага факультэта.

5 На традыцыйным рэспубліканскім бале выпускнікоў акадэмію прадстаўлялі тры лейтэнанты: Яўген Шыт, Ілья Кудрын і Антон Ліплянін. Яўген — кандыдат у майстры спорту па ваенна-прыкладным шматбор'і, выдатнік вучобы, Антон стаў лаўрэатам конкурсу студэнцкіх работ, а Ілья не толькі атрымаў залаты медаль за навучанне, але і быў прэзідэнцкім стыпендыятам, капітанам зборнай акадэміі па баскетболе.

6 Права насіць крапавыя берэты, сімвалы мужнасці воіна, заслужылі 5 курсантаў з 37 навучэнцаў факультэта: лейтэнанты Дзмітрый Лошч, Ігар Чамякін, Дзмітрый Шыбут, Аляксандр Саўко і Мікалай Заяц.

7 Летась каля кантрольна-прапускнога пункта Ваеннай акадэміі ўстанавілі скульптуру «Выпускнік-лейтэнант» (аўтар — Алег Купрыянаў), якая падштурхнула выпускнікоў да новай традыцыі: закладваць каля помніка памятныя пліты з пасланнем да будучага пакалення. Першымі гэта зрабілі выпускнікі ў 2013 годзе. Закладка паслання сёлета адбылася ў чэрвені падчас урачыстага мітынгу.

**Тарас ШЧЫРЫ**

■



Фота БЕЛТА.

# ЛЕТНІК ПА-АРМЕЙСКУ

***(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)***

Святлана Іванова з Лапіцкай сярэдняй школы на абаронча-спартыўны злёт прыехала ўжо другі раз. На базе ўстановы адукацыі дзейнічае ваенна-патрыятычны клуб, у якім займаецца адзінаццацікласніца. Сярод абавязкаў членаў клуба — догляд помнікаў, удзел у гістарычных рэканструкцыях мінулых падзей, наведванне ветэранаў вайны.

— Вельмі люблю спорт і ўсё, што звязана з ваеннай сферай, — прызналася дзяўчына. — Таму, калі прапанавалі яшчэ раз паўдзельнічаць у злёце, пагадзілася, нават не задумваючыся. Асабліва захоплівае гульня «Зарніца». Ты бяжыш і разумееш, што вынікі павінны быць лепшымі, чым мінулы раз. Вайсковае жыццё ў пэўным сэнсе мне блізкае: афіцэрам быў бацька, яшчэ нясе службу дзядуля-генерал, у шэрагах Чырвонай Арміі праз усю вайну прайшоў прадзед. Таму браць удзел у гэтым злёце для мяне вялікі гонар.

Station Станіслаў Няхаеў таксама з сям'і, дзе носяць пагоны: у міліцыі працуюць і маці, і бацька. На злёце прадстаўляў Магілёўскае абласное кадэцкае вучылішча.

— Халтурыць не даводзілася, — расказаў Станіслаў. — Калектыў у нас дружны: слухаем адзін аднаго, добра разумеем. Камандны дух у нас на найвышэйшым узроўні! Не скардзімся і на спартыўную падрыхтоўку.

Летась каманда сярэдняй школы № 209 г. Мінска, якую прадстаўляе Яўген Плескацэвіч, стала другой у ваенна-патрыятычнай гульні «Зарніца». На працягу цэлага года мінскія школьнікі рыхтаваліся да спаборніцтва: ужо ведалі, на што трэба звярнуць асаблівую ўвагу, якія месцы трэба падцягнуць. Усе яны наведваюць ваенна-патрыятычны клуб «Патрыёт», створаны на базе школы. «Магчыма, гэта і гучныя словы, але мы лічым сябе сапраўднымі патрыётамі, — прызнаўся Яўген. — І, спадзяюся, даказалі гэта яшчэ раз падчас злёту. Чаго толькі варты наш танец, песня «Ідзе салдат па горадзе», якая, напэўна, нікога не пакінула абыякавым. Вядома, галоўнае — удзел. Прычым адпачываць летам актыўна — вельмі здарова».

— Мы ганарымся сваімі ўнукамі, праўнукамі, якія з задавальненнем бяруць удзел у самых розных ваенна-патрыятычных акцыях, цікавяцца сваёй гісторыяй, у першую чаргу, падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, — зазначыў **старшыня Беларускага саюза афіцэраў генерал-лейтэнант у адстаўцы Яўген МІКУЛЬЧЫК.** — Мы, у той час іх аднагодкі, вельмі рады, што змагаліся, гінулі, выжывалі не дарма. Усё гэта рабілася для будучых пакаленняў, для іх. І вельмі хочацца, каб сённяшняя моладзь берагла традыцыі сваіх продкаў, любіла і шанавала сваю дзяржаву.

Дарэчы, сваімі навуковымі распрацоўкамі школьнікі ўжо паспелі падзяліцца падчас канферэнцыі «Вялікай Перамозе — 70!». Даследаванні тычыліся пошуку і ўвекавечвання памяці палеглых у гады Вялікай Айчыннай вайны, шэфскай дапамогі ветэранам і іх сем'ям, мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні помнікаў і абеліскаў. Спадзяёмся, што цікавасць да тэмы вайны не знікне ў сённяшняй моладзі пасля святкавання памятных дат, а выльецца ўжо ў больш сур'ёзныя даследаванні, цэлыя праекты.

**Вераніка КАНЮТА.**

■ Жыві і помні

# Служыў Богу і Радзіме

## Жыхары Хорастаўшчыны хочуць увекавечыць памяць славутага святара

1944-2014 70 гадоў вызвалення

**На тэрыторыі Хорастаўскага сельсавета ў гады Вялікай Айчыннай вайны адбыліся падзеі, якія адыгралі вялікую ролю ў гісторыі партызанскага руху Беларусі. Ураджэнцам вёскі Хорастава Васілём Каржом быў створаны першы на Беларусі партызанскі атрад, дзе мужна змагаліся будучыя героі — Вера Харужая, Аляксей Куляшоў, Раман Карасёў, адзін з арганізатараў партызанскага руху на Піншчыне, імя якога носяць вуліцы ў Пінску і Лунінцы. Жыхарамі Хорастаўскага сельсавета з'явіліся браты-патрыёты Міхаіл і Іван Цубы з вёскі Навіна. Тут размяшчаліся штаб Пінскага партызанскага злучэння, аэрадром, шпіталь, друкарня газеты «Палеская праўда». На часовай дыслакацыі ў 1942 і 1943 гг. тут знаходзілася злучэнне партызан Украіны на чале са знакамітым Сідарам Каўпаком. За гады вайны ў барацьбе з фашызмам загінуў кожны другі жыхар сельсавета, усе вёскі без выключэння спалены дашчэнту.**

Аб трагічных наступствах ваеннага ліхалецця ў Хорастаўскім краі ўраджэнцам вёскі Пузічы Аляксандрам Ясько праведзена грунтоўная даследчыцкая праца і напісана кніга «Больно даже мёртвым: Полесская трагедия», выдадзеная ў 2012 годзе. Разам з больш-менш вядомымі, але дэталёва апісанымі фактамі генацыду з боку захопнікаў супраць мясцовага насельніцтва ў кнізе ўсплывае неардынарная фігура ксяндза Францішка Кубшы. Нягледзячы на тое, што яго дзейнасць у Хорастаўскім краі ў савецкі час увогуле не атрымала агалоскі і была асуджана на забыццё, сёння нават тыя, каму ўжо за 80 гадоў, адразу пазнаюць фотаздымак ксяндза Кубшы. Некаторыя з іх — дабаўляючы: «Як жа яго не помніць, калі ён у вайну мяне і шмат іншых дзяцей выратаваў ад смерці?».

Вільгельм-Францішак Карлавіч Кубш нарадзіўся 29 сакавіка 1911 года ў сям'і машыніста паравоза ў невялікім гарадку Гляйвіц, што знаходзіўся на памежжы Германіі і Польшчы. Гарадок, дзе пражывала як нямецкае так і польскае насельніцтва, 31 жніўня 1939 года стаў вядомым на ўвесь свет у сувязі з правакацыяй германскай аперацыі «Кансервы», пасля якой першага верасня 1939-га пачалася Другая сусветная вайна.

Да гэтага часу Кубш атрымаў выдатную ўсебаковую адукацыю. Ён вучыўся ў духоўнай семінарыі аблатаў у Люблінцы, адначасова атрымаў медыцынскую прафесію стаматолага, затым скончыў навіцыят ордэна аблатаў місіянераў Марыі Беззаганнай у Маркавіцах. Пасля пасвяшчэння ў сан святара Кубш амаль тры гады працаваў эканомам духоўнай семінарыі ў горадзе Обр. Яго місіянерская дзейнасць пачалася ў жніўні 1939 года ў палескай вёсцы Лунін, што непадалёку ад Лунінца. Тут ён займаў пасаду вікарыя парафіі касцёла Праабражэння Гасподня, але праз месяц улада змянілася: на пачатку Вялікай Айчыннай вайны Лунінеччына аказалася захопленай германскімі войскамі. Ксяндзу, які дасканала ведаў нямецкую мову, фашысты прапанавалі стаць паліцаем, а пасля яго катэгарычнай адмовы ўстанавілі за ім слежку.

Ксёндз касцёла Святога Юзэфа ў Лунінцы Пачабут-Адланіцкі, ведаючы адкрытасць выказванняў і лютую нянавісць Кубша да нацыстаў, перавёў яго ў Лунецкі касцёл, але і тут навісла пагроза арышту. Тады, каб выратаваць ад праследавання гестапа і зберагчы маладога і гарачага святара, было вырашана накіраваць яго ў сапраўды глухія мясціны — настаяцелем касцёла святой Ганны ў вёску Пузічы. У хуткім часе аб яго добрых медыцынскіх здольнасцях ведалі ва ўсіх навакольных вёсках. Ксёндз Кубш толькі яму вядомымі спосабамі, а таксама дзякуючы настоям з загадзя падрыхтаванымі лекавых траў змог вылечыць вялікую колькасць мясцовых дзяцей. Разам з тым, ён ніколі не забываў расказаць аб сутнасці нямецкага фашызму. З пачаткам кампаніі акупацыйных улад па вывазе моладзі на прымусовыя работы ў Германію ксёндз наведаў амаль усе навакольныя вёскі і на канкрэтных прыкладах і фактах расказаў маладым людзям, што іх чакае ў нямецкім «раі». У выніку моладзь масава пайшла ў партызанскі атрад «Камарова» Васіля Каржа, які прыбыў з Пінска і дзейнічаў на Хорастаўшчыне.

Выявіць зачыншчыка «беспарадкаў» і «сарваных планаў» фашыстам дапамог мясцовы здраднік. У студзені 1942 года Францішак Кубш быў арыштаваны і кінуты ў засценкі гестапаўскай турмы ў Ганцавічах. Пасля пакутлівых допытаў ксяндзу Кубшу быў вынесены вердыкт «вельмі небяспечны вораг Германіі» і святар быў вывезены ў расстрэльную турму, што знаходзілася ў Баранавічах. Дасканала ведаючы нямецкую мову, Кубш змог увайсці ў давер да турэмнага наглядчыка-аўстрыйца, які аказаўся веруючым католікам. Пасля чарговай адмовы выдаць свае сувязі з партызанамі прозвішча ксяндза было ўнесена ў расстрэльны спіс. Падчас расстрэлу групы іншых смертнікаў, наглядчык выкрасліў са спіса прозвішча ксяндза як ужо расстралянага і адпусціў яго.

Ксёндз Кубш у хуткім часе становіцца партызанам атрада Васільева — «Дзядзі Васі», які пазней быў пераўтвораны ў вядомую партызанскую брыгаду імя Леніна.

**Пры непасрэдным удзеле Францішка Кубшы ствараецца ў асноўным з дэпартаваных католікаў першая польская дывізія імя Т. Касцюшкі, затым — батальён імя Эміліі Плятэр з дэпартаваных дзяўчат.**

У складзе злучэння ён сабраў польскую роту з мясцовых католікаў, якая пасля перарасла ў польскі партызанскі атрад імя Касцюшкі пад камандаваннем яшчэ аднаго польскага патрыёта Чэслава Кліма.

У цяжкіх і няроўных баях, што пачаліся з 10 лютага 1943 года, Пінскае злучэнне пад камандаваннем Каржа несла вялікія страты. Загінула падчас бою і доктар злучэння Вольга Чачуліна. А ўсе абавязкі па лячэнні і доглядзе параненых ляглі на плечы Францішка Кубшы.

Але не толькі медыцынскімі справамі абмяжоўвалася партызанская дзейнасць Кубшы. Вядомы факт, што ноччу 6 сакавіка 1943 года менавіта ён падчас прарыву блакады першым з аўтаматам у руках падняў у атаку атрад «Дзядзі Васі», і, нягледзячы на моцны кулямётны агонь праціўніка, партызаны змаглі прарваць кальцо блакады. А затым яшчэ некалькі гадзін збітыя з толку фашысцкія вайсковыя фарміраванні ваявалі адзін супраць другога. Гэта і дазволіла партызанскаму злучэнню адарвацца ад праследавання, а затым вярнуцца на пастаяннае месца дыслакацыі. Штаб Пінскага партызанскага злучэння з сярэдзіны сакавіка 1943 г. і да вызвалення Беларусі знаходзіўся на хутары паблізу вёскі Навіна. Тут жа за трыста метраў ад штаба запрацаваў партызанскі шпіталь, куды і быў тэрмінова пераведзены для выканання сваіх медыцынскіх абавязкаў Францішак Кубш — улюбёнец партызан.

Вяртаючыся з баявых заданняў, партызаны часта прыводзілі палонных — нямецкіх салдат і афіцэраў. Улічваючы тое, што пры штабе толькі адзін чалавек дасканала ведаў нямецкую мову, Корж вымушаны быў задзейнічаць у допытах «языкоў» ксяндза Кубша. Без усялякіх фізічных уздзеянняў той мог выведаць самыя карысныя і неабходныя звесткі для партызан, якія тэрмінова перадаваліся па рацыі на «Вялікую зямлю» — у Беларускі штаб партызанскага руху.

У хуткім часе Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму Іосіфу Сталіну быў прадстаўлены для зацвярджэння спіс будучага складу Нацыянальнага камітэта Свабоднай Польшчы (НКСП). Сярод 16 чалавек, якія туды ўвайшлі, — агульнавядомыя польскія военачальнікі, вучоныя, грамадскія дзеячы. Пад № 9 у гэтым спісе пазначана: «Ксёндз, капелан першага польскага корпуса Кубш Францішак». Напрыканцы мая 1943 года па асабістым загадзе Сталіна, каб забраць партызанскага лекара, з Масквы быў накіраваны самалёт. Паводле ўспамінаў мясцовых жыхароў, перад адлётам Францішак Кубш, паспеў пахрысціць усіх прыведзеных бацькамі да яго дзяцей, прычым як католікаў, так і праваслаўных.

Пры непасрэдным удзеле Францішка Кубшы ствараецца ў асноўным з дэпартаваных католікаў першая польская дывізія імя Т. Касцюшкі, затым — батальён імя Эміліі Плятэр з дэпартаваных дзяўчат. Францішак Кубш у складзе Войска Польскага прымаў удзел спачатку ў вызваленні ад ворагаў беларускіх земляў, а затым сваёй Айчыны — Польшчы. Вядома, што ён не раз удзельнічаў у рызыкоўных баявых аперацыях, паказваючы прыклад асабістай адвагі, мужнасці і гераізму. Францішак Кубш скончыў вайну ў вайсковым званні палкоўніка, на пасадзе генеральнага дэкана Войска Польскага. Яго баявы шлях адзначаны шматлікімі ўзнагародамі СССР, а таксама ардэнамі і медалямі Польскай Рэспублікі, у тым ліку вышэйшай баявой узнагародай Польшчы — ордэнам Віртуці Мілітары.

Пасля вайны ксёндз Кубш з'яўляўся вядомым рэлігійным і грамадскім дзеячам Польшчы. Памёр 27 ліпеня 1978 года. Іменем Кубша названы вуліцы ў польскіх гарадах Зялёная Гура, Вроцлаў, Катавіцы. У апошнім заснаваны музей, прысвечаны славутаму польскаму ксяндзу.

У сваю чаргу, наша Хорастаўшчына і яе жыхары ўдзячны лёсу, што ў самыя трагічныя часы ваеннага ліхалецця гэты Чалавек з вялікай літары знаходзіўся разам з імі. Нягледзячы на злачынствы, масавыя забойствы, учыненыя нацыстамі і іх памагатымі, ён захаваў святую веру ў людзей, сам актыўна змагаўся з акупантамі, самаахвярна дапамагаў людзям, усяляў надзею і веру ў лепшае.

На жаль, імя Францішка Кубшы для сучаснай моладзі нашага краю ні аб чым не гаворыць. У рамках падрыхтоўкі святкавання 70-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа у Вялікай Айчыннай вайне, паводле Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 230, неабходна «... актывізаваць архіўна-даследчыцкую працу па ўстанаўленні імёнаў, лёсаў і месцаў пахаванняў загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны, адкрываць новыя памятныя месцы, ствараць мемарыяльныя зоны».

Думаем, што ў сувязі з гэтым было б справядліва на месцы Пузіцкага касцёла святой Ганны, знішчанага ў гады вайны фашыстамі, дзе працаваў Францішак Кубш, стварыць мемарыяльную зону з помнікам альбо памятным знакам, прысвечаным польскаму патрыёту. Улічваючы, што ў вёсцы Хорастава працуе музей партызанскай славы імя Васіля Каржа, само сабой напрошваецца ўвесці ў яго экспазіцыю матэрыялы і экспанаты аб Францішку Кубшу, прысланыя з Польшчы. З мэтай увекавечання памяці славутага польскага святара добра было б і адну з вуліц Салігорска назваць іменем Францішка Кубша.

**Мікалай ЦУБА, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гуманітарных навук, філасофіі і права ПалесДУ**

■

Краіна здароўя
Выпуск № 12 (323)

■ Доктар адкажа

# ХЕЛІКАБАКТАР ВЫЗНАЧАЕЦЦА І ПА КРЫВІ

**«Раскажыце, калі ласка, пра выяўленне такой бактэрыі, як хелікабактар пілары, па аналізе крыві. У якіх выпадках можна звяртацца да такога метаду абследавання?**

*Вікторыя Бойка, г. Мінск».*

**Загадчыца 1-га тэрапеўтычнага аддзялення 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Ірына УЛАСІК:**

— Правільная дыягностыка Helicobacter pylori — неабходная мера на шляху да папраўкі. Сучасныя метады дыягностыкі дазваляюць выявіць мікраарганізм з дапамогай двух неінвазіўных метадаў абследавання.

Першы метад — дыхальны ўрэазны тэст. Дазваляе вызначыць заселенасць слізістай абалонкі страўніка гэтымі бактэрыямі. Дыхальны аналіз на Helicobacter pylori — аптымальны для кантролю эфектыўнасці праведзенай тэрапіі. Праводзяць даследаванне нашча: бяруць пробы паветра, якое выдыхаецца. Потым пацыент ужывае лёгкі сняданак (сок, малако і інш.) і разам з ім тэставы субстрат. Далей на працягу гадзіны з інтэрвалам 15 хвілін бяруцца чатыры пробы паветра, якое выдыхае пацыент. Тэст праводзіцца з дапамогай мас-спектрометра, які вызначае ў паветры стабілізаваны ізатоп.

Пры выкарыстанні дыхальнага ўрэазнага тэста непраўдзівы вынік можна атрымаць у 4-10 працэнтах выпадкаў. Памылкова адмоўныя вынікі магчымыя ў пацыентаў, якія прымалі перад даследаваннем антысакраторныя і вісмутзмяшчальныя прэпараты, з-за чаго рэкамендуецца звяртацца да такога метаду даследавання не раней як праз месяц пасля ўжывання гэтых прэпаратаў.

Другі метад — імуналагічны (аналіз вянознай крыві). Заснаваны на выяўленні ў хворых, інфіцыраваных Helicobacter pylori, спецыфічных антыцелаў, якія можна выявіць у сываратцы крыві праз 3-4 тыдні пасля інфіцыравання. Дастаткова высокі тытр антыцелаў захоўваецца нават у перыядзе клінічнай рэмісіі захворвання. Адмоўным тэст становіцца пасля паспяховага антыбактэрыяльнага лячэння, што дазваляе выкарыстоўваць метад для кантролю эфектыўнасці такой тэрапіі. Варта толькі ўлічваць, што антыцелы да розных антыгенаў бактэрыі могуць прысутнічаць у крыві на працягу года пасля антыхелікабактарнага лячэння, а таму звярнуцца да гэтага метаду рэкамендуецца не раней як праз год. ■

белагропромбанк
традиции будущего

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 июля 2014 г.
ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 867 741 | 797 431 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 7 254 | 8 095 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 4 460 918 | 4 212 254 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 1 687 921 | 629 280 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 10 218 300 | 5 963 588 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 49 915 004 | 43 741 299 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 788 289 | 701 816 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 2 364 737 | 1 774 266 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 247 | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 541 780 | 573 893 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | | 70 852 191 | 58 401 922 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | 3 332 505 | 526 110 |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 8 333 128 | 7 614 172 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 41 818 922 | 32 009 215 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 5 652 292 | 7 562 132 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 936 | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 403 780 | 722 387 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 59 541 563 | 48 434 016 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 6 803 635 | 6 603 635 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 934 879 | 506 659 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 1 413 121 | 1 151 839 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 2 158 993 | 1 705 773 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 11 310 628 | 9 967 906 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 70 852 191 | 58 401 922 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
за январь – июнь 2014 года
ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 4 699 920 | 4 915 191 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 3 667 513 | 3 522 257 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 1 032 407 | 1 392 934 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 517 985 | 488 843 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 106 697 | 112 571 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 411 288 | 376 272 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 146 | 478 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (6 095) | 8 931 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 238 278 | 131 739 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (1 634) | (3 254) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 187 030 | 426 371 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 432 990 | 298 475 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 985 935 | 840 183 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 128 439 | 127 865 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 805 976 | 811 156 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 138 918 | 233 512 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 667 058 | 577 644 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | | - | - |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | - | - |

**И.о. Председателя Правления** **Н.П.Шевцова**

**Главный бухгалтер** **М.А.Шаповалова**

**Дата подписания «14» июля 2014 г.**

**http://belapb.by/rus/about/bank-activity/indexes/individualnaya-otchetnost-po-nacionalnym-standartam/quarterly-reporting/date_july/**

**ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК**
**время работы Контакт-Центра Банка**
**8.00–20.00 – рабочие дни**
**8.00–18.00 – выходные и праздничные дни**

136

**Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.**

**www.belapb.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

■ Лішняя вага



# ІДЗІ ПАГУЛЯЙ!

**Дзеці з лішняй вагой — гэта праблема не лішняга піражка або цукеркі. Усё значна складаней. Задайце сабе пытанні кшталту: «Як я правёў мінулыя выхадныя з дзецьмі? Як даўно я разлічваў каларыйнасць страў, якія гатуюцца для сям'і? Ці разважаў я над сумяшчальнасцю ўжытых прадуктаў? Ці імкнуся я захаваць падчас гатавання вітаміны? Што я ведаю пра важныя для развіцця і росту дзіцяці мінералы?».**

**Дзеці не ў стане пакуль ацаніць уздзеянне на нервовую сістэму шматгадзіннага прагляду тэлевізара, прааналізаваць шкоду для падстраўнікавай залозы ад ужывання «Кока-колы» ці «Спрайту», усвядоміць, чаму не карысна цэлы дзень валяцца ў ложку з навушнікамі ў вушах? Так што адказваць за ўсё гэта павінны дарослыя.**

Паводле слоў **урача ўльтрагукавой дыягностыкі 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Веранікі ПРАЛЕСКІ,** бацькі доўгі час лічаць умерана лішнюю вагу дзіцяці прыкметай здароўя. І вядуць малое на прыём да ўрача са скаргамі на што заўгодна — сэрцабіццё, галаўны боль, павышаную стамляльнасць, боль у жываце, але толькі не на лішнюю вагу!

Сёння дзіцячыя эндакрынолагі выдатна спраўляюцца з праблемай лішняй вагі. Але толькі пры адной умове — дзіця само павінна хацець развітацца з непатрэбнымі кілаграмамі. Аднак і гэтага будзе недастаткова, калі іншыя члены сям'і не падтрымаюць падобны намер. Ні ў якім разе нельга пакідаць дзіцяці магчымасць для адступлення.

## ШТО ПРЫВОДЗІЦЬ ДА АТЛУСЦЕННЯ?

**1.** Празмернае, незбалансаванае харчаванне. Тлустага, мучнога, салодкага — шмат, агародніны — мізер.

**2.** Адсутнасць рэжыму харчавання. Харчаванне рэдкае, з акцэнтам на вячэрні час.

**3.** Маларухомы лад жыцця.

У групе рызыкі — дзеці з масай цела пры нараджэнні звыш 4 кг; дзеці на штучным кармленні (менавіта яны ва ўзросце да 1 года даюць празмерную прыбаўку ў вазе); дзеці, якія мала рухаюцца або маюць спадчынную схільнасць, недастатковую здольнасць спальваць тлушчы (калі хоць бы адзін з бацькоў мае лішнюю вагу); дзеці, схільныя «заядаць» свае перажыванні, стрэс.

## ПРЫЙШЛО І З САБОЙ ПРЫВЯЛО

Парушэнне тлушчавага абмену, аслабленне імуннай сістэмы, развіццё паталогіі з боку сэрца і сасудаў, парушэнне работы падстраўнікавай залозы з рызыкай развіцця цукровага дыябету, павелічэнне нагрузкі на пазваночнік і суставы, парушэнне постаці або скаліёз, развіццё плоскаступнёвасці.

Дыягназ «атлусценне» дзіцяці выстаўляе група спецыялістаў — педыятр, эндакрынолаг і неўролаг (часам і псіханеўролаг).

## ЯКІМ БУДЗЕ ЛЯЧЭННЕ?

✓ Лячэбная фізкультура.

✓ Карэкцыя харчавання (з абавязковым падтрыманнем бялку, неабходнага для росту і развіцця).

✓ Фізіятэрапія (водныя працэдуры, загартоўванне).

Лячэбнае галаданне, хуткія тэмпы зніжэння вагі не прымяняюцца.

Менш за 20 працэнтаў дзяцей ва ўзросце ад 3 да 7 гадоў маюць дадатковую фізічную нагрузку ў выглядзе заняткаў у спартыўных секцыях. Дзеці з лішняй вагой не робяць ранішнюю гімнастыку (і нават проста размінку), яны не ведаюць, што такое загартоўванне, а гульні і практыкаванні на вуліцы здараюцца ў іх жыцці рэдка. Што і казаць, большасць нашых сем'яў не практыкуе сямейны спорт і аздараўленчую фізкультуру. Фізічная пасіўнасць толькі спрыяе зніжэнню самаацэнкі, замкнёнасці. І пастаянна знаходзіцца апраўданне для сваёй пасіўнасці. Дзіця ляжыць на канапе з булачкай, глядзіць тэлевізар, а бабуля яшчэ і патурае гэтаму: «Ты ўсё роўна ў нас самы прыгожы, самы разумны».

Калі вы з ліку бацькоў, што думаюць, то як мага хутчэй сплануеце візіт да эндакрынолага.

Аднак і да таго візіту, і апрача яго неабходна забяспечыць дзіцяці знаходжанне на свежым паветры. Толькі пры дастатковым і рэгулярным паступленні кіслароду тлушчы акісляюцца і ўтылізуюцца. Так што хоць бы ў самым звычайным тэмпе неабходна гуляць 2 гадзіны штодня!

## ФІЗІЧНЫЯ ПРАКТЫКАВАННІ ДЛЯ РЭГУЛЯРНАГА ВЫКАНАННЯ

Паўтараць 6-8 разоў. Асаблівая ўвага — выдыху. Яго трэба рабіць у момант максімальнага напружання.

**1.** Сесці на падлогу, ногі выцягнуць наперад, рукі перад сабой у «замку». «Крочым» у становішчы седзячы наперад-назад і ўправа-ўлева.

**2.** Сесці на падлогу, ногі выцягнуць наперад, рукамі абаперціся аб падлогу за спінай. На выдыху выгнуцца наверх, адарваць сцёгны ад падлогі. Вярнуцца назад і выдыхнуць.

**3.** Легчы на спіну, рукі ўздоўж тулава. Зрабіць традыцыйны «веласіпед»: круціць нагамі, нібыта едзеш на веласіпедзе. Дыханне вольнае.

**4.** Сесці на падлогу. Рукамі крануць пальцы ног, затым легчы на спіну з рукамі за галавой. На выдыху вярнуцца ў зыходнае становішча.

**5.** Легчы на спіну, рукі ўздоўж тулава. Паднімаць і апускаць прамыя ногі. Пасля 3-4 паўтораў апусціць ногі павольна. Чым бліжэй ногі да падлогі, тым даўжэй трымаць іх узнятымі.

**6.** Стаць на калені, рукамі абаперціся на падлогу. Перанесці вагу цела на рукі, на выдыху выпрастаць ногі, паглядзець на свае калені.

**7.** Стаць на карачкі жыватом угору. Павольна пахадзіць у такім становішчы наперад-назад.

**8.** Легчы на жывот, рукі выцягнуць наперад. Падняць прамыя рукі і ногі ўгору (на выдыху), затрымацца. Крыху пакачацца на жываце наперад-назад.

**9.** Стаць на карачкі жыватом уніз. Падняць на выдыху правую нагу і левую руку паралельна падлозе. Пасля наадварот. Можа спатрэбіцца нейкі час на асваенне гэтага практыкавання.

**10.** Стаць на калені, выпрастаць рукі перад сабой у «замку». Сесці на падлогу па чарзе направа-налева, без дапамогі рук.

**11.** Легчы на спіну, рукі ўздоўж тулава. На выдыху ўзняць прамыя ногі, завесці за галаву, імкнучыся дакрануцца да падлогі пальцамі. Павольна вярнуцца ў зыходнае становішча.

**12.** Легчы на спіну. Пакласці на жывот лёгкі прадмет (можна мяккую цацку). На выдыху — выпучыць жывот, падняць прадмет, на выдыху ўцягнуць жывот, апусціць прадмет.

Не варта баяцца, што дзіця перагрузіцца. Гэта разумныя фізічныя нагрузкі, з якімі неабходна спраўляцца. Проста напачатку можна рабіць большыя інтэрвалы паміж практыкаваннямі. Далей комплекс трэба ўскладняць.

Надзейны спосаб захаваць здароўе дзіцяці — усім членам яго сям'і трымацца здаровага ладу. Усё ж такі дзеці капіруюць дарослых. ■

■ Антыстрэс

# АД НЕЎРОЗУ — РЭЖЫМ ДНЯ



**Чым неўроз адрозніваецца ад іншых захворванняў? Тым, што запускае яго заўсёды стрэс. Стрэс — гэта неабавязкова нейкае велізарнае гора, цяжкія перажыванні і пакуты. Гэта яшчэ і проста непрыемная сітуацыя, якая доўгі час не можа вырашыцца. Ці, скажам, шматгадовая напружаная праца.**

Калі быць уважлівым да сябе, то цяжка не заўважыць, што да цябе завітаў стрэс:

— пачынаеш адчуваць пастаянную стому;

— праблемы са сном (павярхоўны сон, яркія сны, кашмары, складанасці з засынаннем);

— ранняе (на 2-3 гадзіны раней) абуджэнне (гэты момант можа сведчыць пра дэпрэсіўны кампанент неўрозу);

— адчуванне разбітасці пасля начнога сну (сведчанне таго, што нервовая сістэма знясілена і арганізму патрабуецца дапамога);

— раздражняльнасць, змена эмоцый, рэзкія перапады настрою.

— Падобныя адчуванні ў розныя перыяды ці ў пэўных сітуацыях перажываюць усе людзі, — кажа **намеснік галоўнага ўрача па арганізацыйна-метадычнай рабоце 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Ларыса ДЗЯНІСАВА.** — Аднак чым больш мы сабе гэтыя адчуванні забараняем, тым глыбей яны ўкараняюцца ў нас. Таму вельмі важна не проста валодаць сваімі пачуццямі, але і ўмець даваць ім выхад. Парады кшталту «вазьмі сябе ў рукі», «ты гэта можаш» толькі раздражняюць.

На самой справе стрэсам кіраваць можна. Для гэтага даўным-даўно распрацаваны спецыяльныя навукова абгрунтаваныя праграмы, якія тлумачаць, як ствараецца, назапашваецца стрэс, што пры гэтым адбываецца ў арганізме і як гэтыя стрэсы перамагаць.

І не трэба ставіцца да гэтага скептычна. Вопыт выкарыстання падобных праграм тысячы і тысячы разоў даказваў сваю эфектыўнасць. Словам, чытайце і паўтарайце:

**1.** Рэжым працы і адпачынку. Пад працай варта разумець і вучобу, і хатнія клопаты. У арганізме генетычна закладзены механізм сну і няспання. Акрамя таго, свой уласны рытм мае кожны наш орган. І з гэтым нельга не лічыцца.

**2.** Рацыянальнае харчаванне. Яго насычанасць спажыўнымі рэчывамі, жыццёва важнымі вітамінамі, мікраэлементамі і мінераламі. Вітаміны групы В — аснова нармальнага функцыянавання цэнтральнай нервовай сістэмы. Вітаміны А, С, Е — выдатны антыстрэсавы комплекс. Кальцый і магній дапамагаюць перажываць «штормы» і захоўваць раўнавагу. І г.д.

**3.** Злоўжываць нельга не толькі алкаголем ці нікацінам, але і такімі прадуктамі, як шакалад і кава. Апошнія, як і алкаголь, узрушваюць нервовую сістэму, шкодзяць ёй. Акрамя таго, усё пералічанае спрыяе развіццю залежнасці. А навошта нам лішнія залежнасці?

**4.** Памяркоўныя, рэгулярныя фізічныя нагрузкі. Арыентавацца трэба на ўнутраны камфорт. Нездарма адны бегаюць, другія прысядаюць, а трэція плаваюць. Можна хадзіць у сярэднім тэмпе 3-4 разы на тыдні 40-60 хвілін. Галоўнае, што любыя практыкаванні стымулююць расход адрэналіну і запускаюць фізічны, цялесны механізм вызвалення з арганізма рэшткаў малочнай кіслаты — наступстваў стрэсу, што назапашваецца ў нашых мышцах.

**5.** Рэлаксацыя. Зноў жа, аднаму дапамагае тут добрая кніга, другому — цёплая ванна. Але многім людзям гэтага бывае недастаткова. А таму варта пашукаць урача-псіхатэрапеўта. Такі ўрач выкарыстоўвае спецыяльныя методыкі — аўтагенную трэніроўку, нейрамышачную рэлаксацыю, асновы медытацыі, самагіпноз, «глыбокае дыханне». Дапамагчы чалавеку авалодаць гэтымі методыкамі — значыць навучыць яго розум і цела аўтаматычна скідваць нервовае, эмацыйнае і фізічнае напружанне. А значыць — процістаяць стрэсам. ■

■ Новае ў дыягностыцы

# ЁСЦЬ ПРОБА МАНТУ, А ЁСЦЬ ДЫЯСКІНТЭСТ

**Звыш 50-ці гадоў на варце дзіцячага здароўя стаіць туберкулінавая проба Манту. Яна дазваляе вызначыць наяўнасць туберкулёзнай інфекцыі ў арганізме дзіцяці — стан інфіцыраванасці. Аднак вызначыць ступень рызыкі развіцця самога захворвання не ўяўлялася магчымым. Цяпер з гэтай задачай спраўляецца Дыяскінтэст — унутрыскураная проба з выкарыстаннем туберкулёзнага рэкамбінантнага (штучна створанага) алергена.**

— Дыяскінтэст распрацаваны ў НДІ фтызіяпульманалогіі Маскоўскай медыцынскай акадэміі імя І.М. Сечанава, — тлумачыць **загадчыца дзіцячага дыспансернага аддзялення 1-га гарадскога супрацьтуберкулёзнага дыспансера г. Мінска Марына ЛЕЎЧАНКА.** — У Расіі за час прымянення з 2009 года ён паказаў высокую эфектыўнасць. У аснове тэста — вызначэнне рэакцыі арганізма на спецыяльныя рэчывы, якія сустракаюцца толькі ў актыўных мікробах узбуджальнікаў туберкулёзу. Раствор для пастаноўкі Дыяскінтэста змяшчае толькі сінтэтычныя бялкі, вырашчаныя ў кішэчнай палачцы. Прэпарат не таксічны, не выклікае алергічнай рэакцыі.

У нашай краіне правядзенне Дыяскінтэста пачалося ў маі.

## КАМУ ПРЫЗНАЧАЮЦЬ?

✓ тым, хто пражывае ў ачагу туберкулёзнай інфекцыі;

✓ для дыягностыкі туберкулёзу (і дзецям, і дарослым);

✓ у 15, 16 і 17 гадоў штогод.

Вынік проб ацэньваецца праз 72 гадзіны. Рэакцыя можа быць адмоўнай, сумнеўнай і станоўчай. Дзеці з сумнеўным і станоўчым вынікам у бліжэйшыя два тыдні павінны прайсці кансультацыю ў фтызіятра. У такіх выпадках ёсць вялікая верагоднасць таго, што дзіця ўжо хварэе на туберкулёз або мае на гэты момант вялікую рызыку захварэць на яго. Фтызіятр вызначае неабходны комплекс дыягнастычных і прафілактычных мерапрыемстваў у кожным канкрэтным выпадку.

Туберкулінавая проба Дыяскінтэст прымяняецца ў спалучэнні з класічнай туберкулінадыягностыкай (проба Манту). Комплексны падыход да выяўлення туберкулёзу ў дзяцей забяспечвае своечасовасць дыягностыкі.

Сурацьпаказаннямі з'яўляюцца вострыя і хранічныя захворванні падчас абвастрэння.

**P.S.** *У Беларусі захваральнасць на туберкулёз сярод дзіцячага насельніцтва адна з самых нізкіх у Еўропе. Аднак пагроза гэтага небяспечнага інфекцыйнага захворвання ў дзяцей узрастае — туберкулёз стаў больш агрэсіўным, бо з'явіліся формы, устойлівыя да лекаў.* ■

■ Псіхалогія для ўсіх

# ХТО ВЕРЫЦЬ У ПРЫМХІ, ТОЙ НА «КРУЧКУ»

**Прымхі дзіўным чынам уваходзяць у жыццё людзей і аказваюць моцнае ўздзеянне на прыняцце рашэнняў. Як бы смешна гэта ні гучала, але некаторыя людзі вераць у прыкметы — у пустыя вёдры, чорных катоў, якія перабягаюць дарогу, і імкнуцца неяк знізіць верагоднасць непрыемных наступстваў.**

**Калі хоць аднойчы прыкмета «спрацавала», то ўжо не важна, што ты, па вялікім рахунку, дарослы чалавек, упэўнены ў сабе, з пэўнымі інтэлектуальнымі здольнасцямі. Ты чарговы раз убачыў чорную кошку і... плюеш праз левае плячо або чакаеш, пакуль нехта іншы пройдзе перад табой і возьме на сябе ўдар лёсу.**

— Прымхі можна выявіць нават у самым сучасным грамадстве, — кажа **псіхолаг Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Аляксандра ДУДАРАВА.** — Гэтыя перакананні, заснаваныя на страху перад невядомым і спробе кантраляваць будучыню, выкарыстоўваюцца незалежна ад сацыяльнага і эканамічнага статусу грамадства, ад полу і ўзросту чалавека. Рускае «суеверие» азначае веру ў нешта дарэмнае («всуе» — дарэмна, і «верье» — перакананне, вера). Прымхі — гэта ўяўленні, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, з дапамогай якіх людзі шукаюць абароны, магчымасці кантраляваць падзеі, знаходзіць кампрамісы.

Прымхі — гэта і наша жаданне зразумець незразумелае, невядомае. Такім чынам людзі спрабуюць атрымаць уладу над вонкавым светам, кантраляваць тое, што адбываецца. Тут жа трэба мець на ўвазе і нашу абарону перад страхам старэння, смерці, рэальнасці. Ілюзорныя вераванні аслабляюць адчувальнасць болю, звязанага са стратамі, адзінотай, нераздзеленым каханнем, дэпрэсіяй, адсутнасцю сэнсу жыцця, непазбежнасцю смерці. Вераванні падбадзёрваюць чалавека, не дазваляюць даведацца пра свае пачуцці, думкі і жаданні.

Спецыялісты ўказваюць і на тое, што забабоны з'яўляюцца механізмам псіхалагічнай абароны, самадапамогі для людзей, якія перажываюць пастаянны неспакой, з цяжкасцю пераносяць стан няпэўнасці, маюць патрэбу ў псіхалагічным кантролі.

Прымхі выдатна спрыяюць маніпулятыўнаму ўздзеянню. Той, хто верыць у забабоны, больш уразлівы і заўсёды можа стаць для некага мішэнню. Чалавека трывожнага, палахлівага, які знаходзіцца ў нейкай складанай сітуацыі, даволі проста прымусіць паверыць у нейкую звышсілу і тое, што яна можа дапамагчы. Словам, гэта «кручок», на які заўсёды можна зачапіць чалавека. Каб не паддацца псіхалагічнаму ўздзеянню, неабходна адважыцца ўзяць на сябе адказнасць за сваё жыццё, самастойна абдумваць і ўзважваць рашэнні, крытычна ставіцца да любой сітуацыі. Смеласць і рашучасць дазваляюць нам жыць поўным, яркім жыццём, не баючыся непазбежных падзей і не маючы часам на гэта неабгрунтаваных прычын. ■

**Матэрыялы выпуску падрыхтава Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ Праверана на сабе

# НА ЧЭМПІЯНАТ ПА ЧАРНІЦЫ

## Як карэспандэнт «Звязды» браў удзел у масавым зборы ягад



**Ноч перад тым, як адправіцца ў лес, нястомны звяздовец правёў... у Полацкім аддзяленні міліцыі на транспарце. Гэтым, як ні дзіўна, вельмі застаўся задаволеным (матэрыял чытайце ў адным з наступных нумароў). Чарнічны чэмпіянат настолькі прыемна ўразіў, што пісаў рэпартаж амаль цэлы дзень.**



### ГУМАВЫЯ БОТЫ

Шчыра прызнаюся, што ехаць мне на той чэмпіянат не вельмі хацелася. Тым больш у суботу.

А напярэдадні маёй паездкі ў Полацк **Валянціна УЛАСЕНКА, галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Полацкага райвыканкама,** «нагадала», што ў лес трэба абавязкова апрануць куртку з доўгімі рукавамі, а на ногі — гумавыя боты. І сродак для таго, каб «пужаць» камароў, неабходны.

Каб знайсці тыя боты, патурбаваў з дзясятак сваіх знаёмых. Аднакласнік, былы будаўнік, прапанаваў кірзавыя, але яны цяжкія, ды і на пару памераў больш, чым мне трэба. Цесць парадаваў, што ёсць! Але ж 44-га памеру, а мне максімум патрэбен 40-ы. Былая мая калега сказала, што боты ёсць! Але яны ў вёсцы. Зразумеў я, што мае знаёмыя гараджане, як і я, зусім не гатовыя да лясных прыгод.

Нацягнуў на ногі нешта падобнае на кеды — вельмі лёгкі атрымаўся абутак.

Мой цягнік адыходзіў а другой гадзіне ночы. З задавальненнем прайшоўся па родным горадзе, які, аказваецца, у гэты час сутак не спіць. На пешаходнай вуліцы Талстога з кавярні гучала песня «ДДТ». Народ расслабляўся.

### З'ЕЎ КАМАРА

Па тэлефоне супрацоўнікі Полацкага райвыканкама мне сказалі, што роўна ў 6.40 недалёка ад Дома быту адправіцца аўтобус, які павязе ўдзельнікаў чарнічнага чэмпіянату ў лес. Спачатку мяне хацелі ўключыць у склад каманды... медсанчасці, якая адказвае за здароўе супрацоўнікаў мясцовых праваахоўных органаў. Потым, як той казаў, «перайгралі», і мяне даверылі «апякаць» іншым медыкам.

Калі я ўбачыў **Вольгу Сяргееўну КОЧАТАВУ, галоўнага спецыяліста па ідэалагічнай рабоце Полацкай цэнтральнай гарадской бальніцы,** зразумеў, што ў лесе ў мяне будзе больш цікавы аб'ект для асаблівай увагі, чым нейкія ягады... Я ў добрым сэнсе гэта пішу.

— Вы, наогул, у лесе арыентуецеся? Галоўнае — не згубіцца! — звярнулася яна да мяне, калі мы сышлі з дарогі.

— Трэба пакінуць нейкую... — адказаў я.

А што меў на увазе пад словам «нейкую» — і сам не ведаў. Добра, што мабільная сувязь не адключылася. А калі б заблудзіліся, дык была б нагода для напісання артыкула ў рубрыку пра працу выратавальнікаў.

У нашай кампаніі быў яшчэ **Дзяніс ГУТКІН, галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама.** Вялікі яму дзякуй за тое, што дапамог зрабіць здымкі.

Шчыра кажучы, збор чарніц у мяне не ладзіўся. Пакуль Вольга Сяргееўна вельмі хутка знаходзіла ягады і збірала іх, пры гэтым умудраючыся задаваць мне пытанні, я расказваў пра тое, чым займаўся на міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Гаварыў і пра сустрэчы з цікавымі людзьмі. Як таго Астапа Бэндэра, героя твораў Ільфа і Пятрова, які з раніцы нічога не еў, мяне «панесла». І падчас размоў я рабіў перакуры.

А чарніцы тут і там, толькі прыглядзецца трэба, пакланіцца. Раней, дарэчы, мяне ў прафесійным плане раздражняла, калі калегі, пішучы пра збор ягад, пісалі нешта кшталту: «трэба пакланіцца кожнай ягадцы». А так яно ж і ёсць!

Пакуль балбатаў, умудрыўся праглынуць камара.

### ПРА «ЗОРАК»

Працэс збору чарніц актывізаваўся, калі ў лес прыехалі два Алегі з тэлеканала «АНТ»: Гаруноў (аператар) і Шапель (карэспандэнт). Чым здзівіў спадар аператар: ён падчас здымак лепш за ўсіх бачыў, дзе ёсць ягады, і падказваў, дзе лепш збіраць.

— Саня, ты што, па ягадах ходзіш? Во, паглядзі! Во яшчэ, не тут, а направа паглядзі! Ну, зноў наступіў! — звярнуўся да мяне майстар кадра. І вельмі здзівіўся, што ў мяне сёння, аказваецца, чарнічны дэбют.

А яго цёзку чамусьці здавалася, што сёлета чарніц мала. Так і сказаў, калі яны запісвалі так званы стэндап (рэпарцёрскі прыём, калі журналіст працуе непасрэдна ў кадры, на месцы падзеі. — **Аўт**). Агучыў, што наконт колькасці ягад хваліцца асабліва сёлета няма чым. Дык ён узяў жа, каб паказаць гледачам, менавіта маё вядро! А там ягад толькі на донцы на той час і было! Шчыра прызнаюся, не занадта шмат з'явілася і потым.

А вось «мая праўда»: хто хацеў і не ленаваўся, як я, назбіраў поўнае вядро! Некаторыя і грыбоў паралельна трохі. Ёсць чарніцы ў полацкіх лясах, прыязджайце!

Не ведаю, колькі было чарніц летась, але і сёлета нямала. Магчыма, паважаны Алег зрабіў такі захад з-за таго, што па чутках чарніцы «замарозіла», але я ж быў у тым жа лесе і бачыў іх на ўласныя вочы.



Чарнічная каралева, чарніцы і Чарнічны кароль.

Дамы-медыкі спачатку вельмі хваляваліся перад камерай. Але ж хутка высокапрафесійныя цёзкі знайшлі падыход да тых, хто павінен быў трапіць у кадр і адказваць на пытанні.

Дарэчы, потым нечакана для сабе звяздовец стаў у лесе «зоркай». Цікава, што яшчэ перад пачаткам збору ягад некаторыя жанчыны ўсё хацелі ўбачыць «жывога карэспандэнта». А пасля таго, як узважвалі ўраджай, пачаўся «ажыятаж». Некалькі разоў з задавальненнем фатаграфаваўся побач з тымі, хто хацеў фота на памяць. Добра, што аўтограф не прасілі...

Сярод 40 прадстаўнікоў сферы аховы здароўя Полацкага раёна, якія бралі ўдзел у чэмпіянаце, «золата» ў каманды Вароніцкай бальніцы сястрынскага догляду — 20 кг чарніц!

«Серабро» — у каманды Ветрынскай участковай бальніцы (13,5 кг).

«Бронзавы медаль» заваявалі медыкі са стаматалагічнай паліклінікі (11 кілаграмаў 350 грамаў).

### ЧАРНІЧНЫЯ КАРОЛЬ І КАРАЛЕВА

Вынікі чэмпіянату праводзіліся ў Полацку ля знакамітага знака, які паказвае, што гэты горад — цэнтр Еўропы. Вельмі крэатыўна арганізатары падышлі да правядзення святочнай праграмы. У скверы можна было паваражыць пры дапамозе напою з чарніц: на каханне, грошы, здароўе... Я выбраў на каханне... Не верце варажбе! Усё атрымаецца, калі вы шчыра кахаеце!

Медыкі расказвалі пра тое, чым карысныя чарніцы. Працавалі таксама «Ягадная карчма», тэматычнае фотаатэлье, мастацкая і іншыя пляцоўкі — усяго іх было 11. Упершыню правялі конкурс «Ягадная краса».

Самым інтрыгуючым момантам, вядома, стала абранне чарнічных Караля і Каралевы. Пры дапамозе «латарэйнага барабана» вызначылі тых, хто будзе з гонарам насіць гэтыя высокія і насамрэч унікальныя тытулы. У барабане былі прозвішчы тых, хто больш за астатніх назбіраў ягад.

— Чорныя ручкі, зубкі, язычок, — гэта будзе пацвярджэннем таго, што кандыдаты насамрэч збіралі чарніцы, — сказала вядучая цырымоніі.

Каралём стаў... хлопчык Глеб Дзятлаў. А Чарнічнай каралевай — работніца Полацкага лясгаса Анастасія Маразёнак.

— Навінка сёлетняга фестывалю ў тым, што ён праводзіцца і ў горадзе, а не толькі па-за яго межамі. Летась вынікі чэмпіянату падводзілі ў аграгарадку Заазер'е, раней — на беразе возера Белае, любімым месцы масавага адпачынку. Зразумела, не ўсе могуць з самай раніцы адправіцца ў лес па чарніцы. Галоўная задача чэмпіянату — зрабіць для людзей свята. Думаю, налета запросім узяць удзел у чэмпіянаце прадстаўнікоў гарадоў-пабрацімаў, а іх у Полацка аж 24. І пакажам гасцям, як беларусы ўмеюць збіраць ягады, шанаваць сваю прыроду, родны край, святкаваць! — пракаментаваў **Пётр ПЯТКЕВІЧ, намеснік старшыні райвыканкама па сацыяльных пытаннях.**

А чарніцы я ўсё ж прывёз у Віцебск. Паўлітровы слоік з чарніцамі аддаў сваім любімым сынам.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*Полацкі раён — Полацк — Віцебск.*

**Фота аўтара і Дзяніса ГУТКІНА**

■ Побач з мегаполісам

# ПРЫГАЖОСЦЬ ЭКАНОМІКІ



## У агракамбінаце «Ждановічы» развіваецца і кветкаводства

**У новай цяпліцы «Багатырова» на плошчы ў 2,2 гектара ўжо другі год вырошчваюць ружы па галандскай тэхналогіі. За год прададзена болей за 2 мільёны 300 тысяч кветак. Лічба, пагадзіцеся, уражлівае. Хаця гэта фактычна толькі пачатак. «Пакуль што мы вывучаем рынак, шукаем найбольш выгадны фармат зносін з аптовым пакупніком», — заначае начальнік планава-эканамічнай службы камбіната Тамара ІЛЬІНА.**



Праўда, нельга не заўважыць, што вывучаюць дастаткова паспяхова. Сёння ў гаспадарцы працуе пяць крам, якія займаюцца выключна продажам кветак. Але гэта не значыць, што ждановіцкія кветкі толькі там і рэалізуюцца. Ёсць яшчэ месцы і на рынках Мінска. І ўвогуле, дагаворы на рэалізацыю заключаны з 900 арганізацыямі. Адгрузка штодня складае ад 7 да 17 тысяч кветак. Зразумела, што рэкорды па продажы выпадаюць на святы — найперш на 8 сакавіка і 1 верасня. Дарэчы, кошт адной кветкі ў залежнасці ад даўжыні сцяблінкі вагаецца ад 8 да 15 тысяч рублёў.

Сапраўднае ружовае каралеўства ў цяпліцы «Багатырова» захапляе. Між іншым, ёсць нават адзін гатунак без калючак. Ждановіцкія кветкаводы жартуюць: з такіх кветак трэба складаць букеты мужчынам, якія правініліся. І калі жонка ці проста каханая задумае шпурнуць кветкамі ў твар, то, паверце, абыдзецеся без наступстваў. І назва ў гэтага сорту — «Аква». А калі сур'ёзна, то калючкі асабліва прымушаюць кветкаводаў (іх у цяпліцы працуе 18) быць уважлівымі да мер бяспекі. Хаця ўвогуле, сведчаць руплівіцы, кожная з каторых улюбёная ў кветкі, ружовая гаспадарка — незвычайнае месца працы. І колеры, і пахі нагадваюць, што ты знаходзішся ў палоне прыгажосці.

— Дома ўжо, відаць, не да кветак? — пытаемся ў **старшага майстра Наталлі МІРАНОВІЧ.**

Але памыляемся. Аграном па адукацыі, яна лічыць кветкаводства сваім галоўным прызваннем. Дома ў гарадской кватэры Наталлі Анатольеўны — болей за 50 гатункаў розных кветак. У хатняй аранжарэі ёсць фікусы трох відаў, драцэны — чатырох, асабліва шмат фіялак. А яшчэ кветкавод прызнаецца, што болей за ўсё на свеце любіць палявыя васількі. І вельмі шкадуе, што іх не вырошчваюць у аранжарэях.

На фоне іншых здабыткаў «ружовая прамысловасць» агракамбіната «Ждановічы» выглядае, зразумела, даволі сціпла. Але ж гэта толькі пачатак, набыццё першага сур'ёзнага вопыту, першыя, так бы мовіць, уколы... У шматвектарнай гаспадарцы на зямлі паблізу горада павінны быць улічаны ўсе патрэбы вялікага мегаполіса. Ды і спрацоўвае ў арганізатараў сельскагаспадарчай вытворчасці пачуццё патрыятызму: а навошта, маўляў, нам на рынку набываць замежныя кветкі? Яны ж і па якасці саступаюць, бо пасля таго, як іх зрэжуць з куста, на шмат пазней трапляюць да пакупніка, чым айчынныя прыгажуні. Ды і каштуюць даражэй у два-тры і нават болей разоў... Несумненна, і добрую якасць, і нізкі кошт — усё гэта з часам заўважыць самы шырокі пакупнік. А значыць, наперадзе ждановіцкіх кветкаводаў чакаюць толькі поспехі.

**Сяргей ШЫЧКО,**
**Наталля АСМОЛА (фота)**



■ Педагагічны нефармат

# ВУЧОБА БЕЗ СУМУ І ПРЫМУСУ,

## або Што кожнае лета вабіць настаўнікаў фізікі ў Альхоўку?

**Альхоўка — гэта асаблівае месца, якое валодае таямнічым прыцягненнем. Штогод тут збіраюцца настаўнікі з розных рэгіёнаў Беларусі, аб'яднаныя агульнай мэтай, крэатыўным мысленнем, гатовыя вучыцца і дзяліцца з іншымі сваімі знаходкамі. Тут набываеш новых сяброў і з радасцю сустракаешся са старымі.**

А належыць ідэя правядзення летніка двум фізікам — настаўніку з Астраўца Анатолю Бацюлеву і прафесару Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Мікалаю Запрудскаму. Яна нарадзілася падчас дэсанту выкладчыкаў фізікі ў Гродзенскі інстытут удасканалення у кастрычніку 1989 года. А ўжо ў чэрвені 1990 года педагогі шукалі месца для будучага летніка.

Пэўную ролю ў выбары менавіта гэтага прыгожага куточка на Астравеччыне адыграў дырэктар мясцовай школы Яўген Чабатароў. Ён шмат гадоў заставаўся актыўным удзельнікам і гасцінным арганізатарам летніка, прадастаўляючы памяшканне школьнай сталовай, інтэрната і камп'ютарнага класа... Яўген Чабатароў і цяпер заўсёды прыходзіць на самыя цікавыя мерапрыемствы летніка. А яго справу працягвае цяперашні дырэктар школы Сяргей Гаўрыловіч.

### ЗАНЯТКІ Ў «ЗЯЛЁНЫМ» КЛАСЕ

Альхоўка размясцілася на беразе ракі Страча, якая бярэ пачатак ад Блакітных азёраў і недалёка ад вёскі ўпадае ў Вілію.

На працягу сямі дзён на беразе рэчкі раскінута шмат палатак. Школьная дошка на бярозах, беларускія песні пад гітару ля вечаровага вогнішча, «зялёны» клас на паляне, юшка, якая булькае ў вёдрах — усё гэта стварае непаўторную чароўнасць летніка. У падрыхтоўцы ўсіх мерапрыемстваў супрацоўнічаюць і тыя, хто прыехаў сюды дваццаць пяты раз, і тыя, хто прыехаў упершыню. Тут усе — на роўных. Кожны сам прымае рашэнне, калі ён будзе дзяжурыць на кухні, якія мерапрыемствы будзе рыхтаваць, у якіх майстар-класах удзельнічаць. Самавызначэнне — адзін з асноватворных прынцыпаў летніка ў Альхоўцы.

З моманту яго заснавання ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў заўсёды знаходзіліся пытанні ўзаемадзеяння вучня і настаўніка, навучання школьнікаў рашэнню фізічных задач, фізічны эксперымент, правядзенне сярод школьнікаў алімпіяд і турніраў. З 1996 года ў змесце кожнага летніка з'яўляюцца праблемныя курсы па актуальных для адукацыі тэмах, а з 2001 года прафесар кафедры педагогікі і менеджменту адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Мікалай Запрудскі чытае аўтарскія курсы.

Леташнія курсы прысвячаліся тэорыі і практыцы абагульнення педагагічнага вопыту. І як вынік, на працягу наступнага навучальнага года 7 удзельнікаў курсаў паспяхова вытрымалі экзамен на кваліфікацыйную катэгорыю настаўнік-метадыст (а гэта, між іншым, найвышэйшы пілатаж у прафесіі), а многія пацвердзілі вышэйшую катэгорыю.

Тэма сёлетніх курсаў «Сучасныя электронныя сродкі навучання ў адукацыйным працэсе школы, гімназіі і ліцэя» выклікала вялікую зацікаўленасць у настаўнікаў.

### КАЦІЛЬЁН, ПАЛАСА ПЕРАШКОД І НАЧНОЕ АРЫЕНТАВАННЕ

Але вучэбныя заняткі — гэта толькі адзін бок летніка ў Альхоўцы. Ёсць яшчэ і другі — яскравы і захапляльны: гэта розныя спаборніцтвы, конкурсы, канцэрты і іншыя мерапрыемствы, якія ладзяцца ў вячэрні час. На працягу дваццаці пяці гадоў шляхам генерыравання і апрабацыі ідэй, спроб і памылак, адбору ўдалых знаходак склаліся традыцыі летніка, якія з'яўляюцца асновай тыднёвага свята ў Альхоўцы. Так, урачыстае адкрыццё летніка абавязкова праходзіць у выглядзе кола знаёмстваў, дзе кожны ўдзельнік прадстаўляе сябе іншым: хто ён, што прывяло яго ў летнік, распавядае пра самыя значныя падзеі за апошні год. Чытаюцца пасланні ад удзельнікаў папярэдняга летніка, падымаецца сцяг і гучыць песня.

**Перамагае тая каманда, якая не толькі хутка бегае, але і лепей ведае фізіку, гісторыю і родную мову.**



Канцэрт «першагодак».

Заўсёды ўсе з нецярплівасцю чакаюць канцэрт «першагодак» (першагодкамі называюць навічкоў). Традыцыйна весела праходзіць фізіка-спартыўная паласа перашкод, якая складаецца са спартыўных і інтэлектуальных этапаў. Перамагае тая каманда, якая не толькі хутка бегае, але і лепей ведае фізіку, гісторыю і родную мову. Удзельнікі часта трапляюць у незвычайныя сітуацыі...

Найбольш прыгожым вечарам адпачынку ў Альхоўцы звычайна з'яўляецца кацільён, або баль пад соснамі. Запаленыя кандэлябры, упрыгожванне «лясной залы» кветкамі, удзельнікі ў вячэрніх сукенках і фраках — усё гэта стварае атмасферу вытанчанасці і элегантнасці. Кожны выбірае для сабе ролю, імя і рыхтуе адпаведны строй.

Ёсць у альхоўцаў і свой элітарны клуб — «Акадэмія» летніка. Каб стаць правадзейным яго членам, альхоўцу трэба эфектыўна папрацаваць у летніку на працягу 10 гадоў. Урачысты рытуал прысвячэння ў «акадэмікі Альхоўкі» ўпрыгожваюць сяброўскія віншаванні. Адначасова з гэтай падзеяй уручаюцца юбілейныя сертыфікаты з падзякай за плённую працу ў альхоўскім летніку на працягу 5, 10, 15 ці 20 гадоў.

Шмат эмоцый выклікае начное арыентаванне: перад камандамі стаіць задача знайсці 5 пікетаў, схаваных у лесе і на возеры, выкарыстоўваючы толькі карту, компас, ліхтарык і сваю інтуіцыю. Праводзяцца і начныя астранамічныя назіранні, святкуецца найпрыгажэйшае народнае свята Купалле. Нават ёсць свая паходная лазня з купаннем у Страчы. Апошнім часам добрай традыцыяй летніка стала правядзенне экскурсій па роднай беларускай зямлі.



Педагогі, на старт!

### ЛАНЦУГОВАЯ РЭАКЦЫЯ

Праект «Альхоўка» існуе ўжо 25 гадоў. Ён стаў рэальнасцю і падтрымліваецца дзякуючы многім неабыякавым асобам.

Кожны педагог вяртаецца з Альхоўкі з новымі ведамі, матэрыяламі, агульнымі творчымі напрацоўкамі, выдатнымі ідэямі і незабыўнымі ўражаннямі. Усё гэта знаходзіць творчае выйсце ў апублікаваных артыкулах, дапаможніках для настаўнікаў, распрацоўках урокаў. Распаўсюджванне ведаў, атрыманых у Альхоўцы, звычайна нагадвае працэс, які фізікі называюць «ланцуговай рэакцыяй». Спачатку ідэі аўтара і натхняльніка летніка Мікалая Запрудскага рэалізуюцца праз аўтарскія заняткі і майстар-класы спецыялістаў. Затым удзельнікі распавядаюць пра напрацоўкі сваім калегам у школах, праводзяць выязныя трэнінгі, заняткі на фестывалях і курсах, ствараюць майстар-класы для зацікаўленых настаўнікаў. За 25 гадоў альхоўцы напісалі кандыдацкія і магістарскія дысертацыі, выдалі шмат кніг, выгадавалі вялікую колькасць пераможцаў алімпіяд і конкурсаў даследчых работ, здабылі перамогі ў прафесійных конкурсах.

Напэўна, у кожнага чалавека ёсць месца на зямлі, дзе табе заўсёды рады, дзе цябе паважаюць і чакаюць, дзе ёсць аднадумцы, якія вераць у тваё здольнасці і захапляюцца тваімі поспехамі. Беларускім настаўнікам фізікі пашанцавала — у іх ёсць Альхоўка!

**Эла ЯКУБОЎСКАЯ,**
**настаўніца фізікі,**
**гімназія №1 г. Жодзіна.**
**(У Альхоўцы была 8 разоў).**
**Фота аўтара**

# ВЫДАТНІКІ ВЫБІРАЮЦЬ... МАГІСТРАТУРУ

**Сярэдні конкурс у магістратуру Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта склаў сёлета 3 чалавекі на месца. Па словах рэктара Аляксандра ЖУКА, гэта цудоўны вынік.**

— Паступленне ў магістратуру — свядомы крок. Многія студэнты рыхтуюцца да паступлення ў магістратуру на працягу двух ці трох апошніх гадоў, удзельнічаюць у навуковых канферэнцыях, навуковых даследаваннях, рыхтуюць публікацыі, — падкрэслівае Аляксандр Жук. — Больш як у 50 чалавек, якія паступілі ў магістратуру, ужо больш за дзве навуковыя публікацыі.

Усяго ў магістратуру было залічана 156 чалавек (у 2013 годзе — 140). Сярод залічаных 18 чалавек маюць дыпломы з адзнакай. Сярэдні бал тых, хто паступіў у магістратуру БДПУ, склаў 8,3 бала.

Абітурыентаў, якія здалі ўступныя іспыты на 10 і 9 балаў, больш за 45 чалавек. Толькі на 10 балаў здалі ўступныя іспыты будучыя магістранты, якія будуць навучацца па спецыяльнасці «Тэорыя і методыка навучання і выхавання» (беларуская літаратура), на 10 і 9 балаў — па спецыяльнасцях «Літаратуразнаўства», «Мовазнаўства», «Тэорыя і методыка навучання і выхавання» (руская мова) і г.д.

Найбольшая колькасць прэтэндэнтаў была зафіксавана ў магістратуры на спецыяльнасці «Псіхалогія» (25 чалавек), «Адукацыйны менеджмент» (13 чалавек), «Тэорыя і методыка дашкольнай адукацыі» (12 чалавек) і «Айчынная гісторыя» (12 чалавек).

# ДЛЯ ІХ ФІЗІКА — НЕ ПРАБЛЕМА

**Міжнародны турнір юных фізікаў уяўляе сабой камандныя спаборніцтвы старшакласнікаў ва ўменні рашаць складаныя задачы, прадстаўляць і абараняць свае вынікі ў навуковых дыскусіях, якія называюцца «фізічнымі баямі». Мова турніру — англійская.**

Міжнародны арганізацыйны камітэт адбірае 17 задач і публікуе іх за год да спаборніцтваў. Гэтыя заданні ахопліваюць розныя галіны фізікі і часцей за ўсё маюць міждысцыплінарны характар. Яшчэ на этапе падрыхтоўкі ўдзельнікі праводзяць неабходныя эксперыменты, разбіраюцца з тэорыяй, кансультуюцца ў экспертаў. Важную ролю тут адыгрываюць уменне арганізаваць свой час і ўменне працаваць у камандзе. Вынікам папярэдняй падрыхтоўкі становяцца структураваныя даклады, якія выносяцца на сам турнір.

Кожная краіна-ўдзельніца адпраўляе на міжнародны турнір адну каманду, якая складаецца з пяці старшакласнікаў і двух трэнераў. У склад каманды ліцэя БДУ ўвайшлі дзесяцікласніца Анастасія Казлова і адзінаццацікласнікі Мікіта Акуліч, Віктар Лойка, Антон Сілюк і Данііл Мневец. Падрыхтоўкай ліцэістаў займаліся чацвёртакурснік факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ Станіслаў Красулін і трэцякурсніца фізічнага факультэта БДУ Таццяна Пыжык.

Усяго ў турніры ўдзельнічалі 28 каманд з розных краін свету. Залатымі прызёрамі ў гэтым годзе сталі школьнікі з Сінгапура, а «серабро» заваявалі юныя фізікі са Славакіі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БА №№ 0590557, 0590558,0618175, 0589897, 0561752, 0601026, серии СО №№ 0012650, 0012651, 0012653, 0012654; страховые полисы по гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВР №№ 3270025, 3270026 **считать недействительными.** УНП 100357923

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский пищеторг» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:**

**Лот № 1: ЗДАНИЕ СПЕЦИАЛИЗИРОВАННОЕ РОЗНИЧНОЙ ТОРГОВЛИ (магазин № 28), инв. № 610/С-44723, общ. пл. 157,8 кв.м, КОТЕЛ ОТОПИТЕЛЬНЫЙ КС-ТГ-12,5 и ТРУБОПРОВОД ГАЗОВЫЙ** на зем. участке пл. **0,0405 га в г. Борисов, ул. Жуковича, 3**.

**Начальная цена с НДС – 292 008 000 бел. руб. Задаток 10% (29 200 800 бел. руб.).**

**Лот № 2: ЗДАНИЕ МОЛОЧНОЙ КУХНИ, инв. № 610/С-43420, общ. пл. 405,0 кв.м,** на зем. участке пл. **0,0930 га в г. Борисов, пер. Фридриха Энгельса, 14.** Недвижимое имущество обременено договором аренды (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона).

**Начальная цена с НДС– 936 657 600 бел. руб. Задаток 10% (93 665 760 бел. руб.).**

**Задатки перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

*Предыдущие извещения о проведении торгов опубликованы в газете «Звязда» 14.03.2014, 26.03.2014.*

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **01.08.2014 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **31.08.2014 до 16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**по объекту «Многоквартирные жилые дома со встроенными помещениями общественного назначения по генплану №№ 12, 13, 14, 20 в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко». 2-я очередь строительства. Жилой дом № 12 по генплану», опубликованную в газете «Звязда» 29.11.2013 года»**

**Застройщик:** Общество с ограниченной ответственностью «БелБизнесРесурс», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 15 декабря 2006 г. № 2548 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190782901.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, переулок Червякова, дом 21А, помещение 3, кабинет 6.

***Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (017) 388 54 64, 8 (029)654 10 10, 8(029) 708 46 64.***

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц в жилом доме № 12 по ГП:

1-комнатные квартиры – при оплате в рассрочку 1550 (Одна тысяча пятьсот пятьдесят) долларов США, при условии 100% единовременной оплаты стоимость 1500 (Одна тысяча пятьсот) долларов США. УНП 190782901

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

**28 августа 2014 года проводит 16-ый открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 267 | Труба алюминиевая из комплектаПМТА-150 (L=6000 мм, d=150мм) 1979 г. 5 кат. Партия 50 шт. | н.п. Калинковичи, в/ч 55461/2 | 115 000 000 | 11 500 000 |
| 268 | Труба алюминиевая из комплектаПМТА-150 (L=6000 мм, d=150мм) 1979 г. 5 кат. Партия 50 шт. | н.п. Калинковичи, в/ч 55461/2 | 115 000 000 | 11 500 000 |
| 269 | Труба алюминиевая из комплектаПМТА-150 (L=6000 мм, d=150мм) 1979 г. 5 кат. Партия 50 шт. | н.п. Калинковичи, в/ч 55461/2 | 115 000 000 | 11 500 000 |
| 270 | Труба алюминиевая из комплектаПМТА-150 (L=6000 мм, d=150мм) 1979 г. 5 кат. Партия 50 шт. | н.п. Калинковичи, в/ч 55461/2 | 115 000 000 | 11 500 000 |
| 271 | Труба алюминиевая из комплектаПМТА-150 (L=6000 мм, d=150мм) 1979 г. 5 кат. Партия 50 шт. | н.п. Калинковичи, в/ч 55461/2 | 115 000 000 | 11 500 000 |
| 272 | Труба алюминиевая из комплектаПМТА-150 (L=6000 мм, d=150мм) 1979 г. 5 кат. Партия 50 шт. | н.п. Калинковичи, в/ч 55461/2 | 115 000 000 | 11 500 000 |
| 273 | Труба алюминиевая из комплектаПМТА-150 (L=6000 мм, d=150мм) 1979 г. 5 кат. Партия 50 шт. | н.п. Калинковичи, в/ч 55461/2 | 115 000 000 | 11 500 000 |
| 274 | Труба алюминиевая из комплектаПМТА-150 (L=6000 мм, d=150мм) 1979 г. 5 кат. Партия 52 шт. | н.п. Калинковичи, в/ч 55461/2 | 115 000 000 | 11 500 000 |
| 275 | Труба алюминиевая из комплектаПМТА-150 (L=6000 мм, d=150мм) 1979 г. 5 кат. Партия 52 шт. | н.п. Калинковичи, в/ч 55461/2 | 119 600 000 | 11 960 000 |
| 276 | Труба алюминиевая из комплектаПМТА-150 (L=6000 мм, d=150мм) 1979 г. 5 кат. Партия 50 шт. | н.п. Калинковичи, в/ч 55461/2 | 115 000 000 | 11 500 000 |
| 277 | Труба алюминиевая из комплектаПМТА-150 (L=6000 мм, d=150мм) 1979 г. 5 кат. Партия 50 шт. | н.п. Калинковичи, в/ч 55461/2 | 115 000 000 | 11 500 000 |
| 278 | Труба алюминиевая из комплектаПМТА-150 (L=6000 мм, d=150мм) 1979 г. 5 кат. Партия 50 шт. | н.п. Калинковичи, в/ч 55461/2 | 115 000 000 | 11 500 000 |
| 279 | Труба алюминиевая из комплектаПМТА-150 (L=6000 мм, d=150мм) 1979 г. 5 кат. Партия 50 шт. | н.п. Калинковичи, в/ч 55461/2 | 115 000 000 | 11 500 000 |
| 280 | Труба алюминиевая из комплектаПМТА-150 (L=6000 мм, d=150мм) 1979 г. 5 кат. Партия 62 шт. | н.п. Калинковичи, в/ч 55461/2 | 142 600 000 | 14 260 000 |
| 281 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. М0168800 дв. 749544 1991 г. 4 кат. 25840 км | г. Гродно, в/ч 05733 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 282 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. L0154147 дв. 650170 1990 г. 4 кат. 12850 км | г. Гродно, в/ч 05733 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 283 | Грузовой Урал-43202 ш. 039420 дв. 756449 1985 г. 4 кат. 49338 км | г. Борисов, в/ч 59884 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 284 | Грузовой Урал-4320 ш. 079131 дв. 109294 1987 г. 4 кат. 46794 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 285 | Грузовой КамАЗ-4310 ш. 0046869 дв. 0284230 1988 г. 4 кат. 95954 км | г. Береза, в/ч 23324 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 286 | Автошасси Урал-43203-1012 ш. 075929 дв. 081221 1987 г. 4 кат. 4088 км Кузов-фургон К1.4320 №07135 1987 г. 4 кат. | г. Береза, в/ч 23324 | 55 000 000 | 5 500 000 |
| 287 | Грузовой Урал-4320 ш. 039744 дв. 763764 1985 г. 4 кат. 18315 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 288 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11430847 дв. 7AG0354E 1987 г. 4 кат. 19645 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 289 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11451222 дв. 7AK0361E 1989 г. 4 кат. 2015 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 290 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 114308515 дв. 7AG03л9E 1987 г. 4 кат. 416 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 291 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11430821 дв. 7AU0323E 1987 г. 4 кат. 575 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 292 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11430813 дв. 7AG035E 1987 г. 4 кат. 416 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 293 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11430811 дв. 7AG034E 1987 г. 4 кат. 406 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 294 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11341432 дв. 7X0715E 1976 г. 4 кат. 124 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 295 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 1145126 дв. 7AK0383E 1989 г. 4 кат. 2171 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 296 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 1143088 дв. 7AG0294E 1987 г. 4 кат. 2556 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 297 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11430629 дв. 7AQ039E 1987 г. 4 кат. 302 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 298 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11430617 дв. 7AC0158E 1987 г. 4 кат. 169 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 299 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11430614 дв. 7AC0180E 1987 г. 4 кат. 1083 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 300 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11430612 дв. 7AC024E 1987 г. 4 кат. 201 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 301 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11430611 дв. 7AC0147E 1987 г. 4 кат. 1085 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 302 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 1143069 дв. 7AC0152E 1987 г. 4 кат. 1017 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 303 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 1143067 дв. 7AG0153E 1987 г. 4 кат. 426 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 304 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11332271 дв. 7W11120E 1977 г. 4 кат. 985 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 305 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 1143063 дв. 7AC0162E 1987 г. 4 кат. 233 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 306 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11430852 дв. 7AU029E 1987 г. 4 кат. 527 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 65 000 000 | 6 500 000 |

**Аукцион** состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **28 августа 2014 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 25 августа 2014 года**.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10**-ти банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.**

ФРАНСАБАНК FRANSABANK

**«Франсабанк» Открытое акционерное общество**

Республика Беларусь, г. Минск, пр. Независимости, 95А

тел.: (017) 389 36 36, факс: (017) 389 36 37

office@fransabank.by www.fransabank.by

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2014 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2014 | 01.07.2013 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 86 598 | 66 019 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 24 | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 192 760 | 143 263 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 29 845 | 48 578 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 35 573 | 106 826 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 484 410 | 342 179 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 1 | 1 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 172 075 | 141 357 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 3 889 | 5 981 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 1 005 175 | 854 204 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 39 897 | 39 255 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 366 493 | 252 410 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 273 744 | 264 869 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | - | 21 056 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 3 605 | 2 467 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 683 739 | 580 057 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 113 704 | 113 704 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 6 994 | 5 685 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 118 374 | 90 810 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 82 364 | 63 948 |
| 30 | ВСЕГО капитал | 121 | 321 436 | 274 147 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 1 005 175 | 854 204 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2014 | 01.07.2013 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 51 819 | 38 418 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 22 678 | 17 385 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 29 141 | 21 033 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 12 820 | 8 713 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1 240 | 1 083 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 11 580 | 7 630 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 2 | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (63) | (49) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 14 485 | 10 348 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 510 | (11) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 4 134 | 2 346 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 451 | 278 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 32 520 | 26 807 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 1 705 | 1 623 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 17 747 | 8 453 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 3 308 | 709 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 14 439 | 7 744 |

**Заместитель Председателя Правления** **Игнатов А.В.**

**Главный бухгалтер** **Падёнова Л.Б.**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 15 от 26.04.2013 г. УНП 100755021.*

**Открытое акционерное общество**

## «Дорожно-строительный трест № 3»

**сообщает о проведении внеочередного собрания акционеров, которое состоится 31 июля 2014 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

**Повестка дня:**

**1. О распределении чистой прибыли и дивидендов за I полугодие 2014 года.**

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться 31.07.2014 г. с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 30.07.2014 г.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с материалами к собранию по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 33.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – доверенности, зарегистрированные в соответствии с действующим законодательством).

Справки по телефонам: 28-40-20, 23-64-87 – Отдел правовой и кадровой работы, Наблюдательный совет. УНП 700049607

Свидетельство о регистрации и печать ЗАО «Спектрбум», ИНН 101206151 **утеряны и являются недействительными.**

Свидетельство о регистрации и печать ЗАО «Аскадпейпер», ИНН 101165189 **утеряны и являются недействительными.**

05.08.2014 г. в 16.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Сантехэлектромонтаж».

Повестка дня:

1) О выпуске облигаций общества.
2) О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Сантехэлектромонтаж»: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а.

Время регистрации в день проведения собрания с 15.30 до 16.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 30.07.2014 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 400052115 Наблюдательный совет.

## НЕСВИЖСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

## 11 августа 2014 года в 11.00 проводит повторно открытый аукцион на право заключения договора аренды земельного участка:

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Срок аренды |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская обл., г. Несвиж, район, ограниченный улицами Молодежная, Достоевская, 1 Мая, к/н 624250100001004735, назначение – строительство и обслуживание 140-квартирного жилого дома повышенной комфортности, арендодатель – Несвижский районный исполнительный комитет | 1,1522 | Возможность подключения электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения, канализации, улицы | 805 754 600 | 150 000 000 | 70 лет |

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; не позднее 2 рабочих дней после выполнения вышеуказанных действий заключить с районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок с даты заключения договора аренды государственную регистрацию права на земельный участок.

Земельный участок, расположенный по адресу: г. Несвиж, (район, ограниченный улицами Молодежная, Достоевского и 1 Мая) предоставляется победителю с условиями:

осуществления в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка, государственной регистрации прав на земельный участок;

получения в установленном порядке разрешения на проведение проектных работ на строительство 140-квартирного жилого дома повышенной комфортности;

занятия земельного участка (начать строительство) не позднее шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство 140-квартирного жилого дома повышенной комфортности;

осуществления благоустройства прилегающей территории, определенной архитектурным и строительным проектами;

возврата переданного в аренду земельного участка по миновании надобности (но не позднее срока, на который он предоставляется) в состав земель г. Несвижа в состоянии, пригодном для использования по назначению, или продления в установленном порядке срока аренды на него;

передачи в жилой фонд Несвижского района 5 процентов общей площади жилых помещений.

Задаток перечисляется в срок по 8 августа 2014 года на р/с 3641200070018 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код 523, г. Несвиж, УНП 600038472, получатель платежа – Несвижский районный исполнительный комитет.

Заявление на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами (ксерокопия паспорта, ксерокопия выписки из банка об открытии лицевого счета, квитанция об оплате задатка) принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Несвиж, ул. Советская, 1, каб. 312, тел. (8 01770) 5 48 65. Последний день подачи заявок – 8 августа 2014 года до 17.00. УНН 600038472

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**22.08.2014 в 11.00 по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. № 204, по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на пять лет для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складских помещений, оказания услуг.**

## Организатор аукциона – РУП «Белтелеком» в лице Гродненского филиала,

**230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А.**

| Адрес арендуемого имущества | № Лота | Площадь, кв.м | Коэффициент от 0,5 до 3,0 | Начальная цена продажи, базовые арендные величины* | Размер задатка, базовые арендные величины* | Характеристика |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Капитальное строение, здание АТС-2, 4-й этаж, помещения, Гродненская область, Лидский район, г. Лида, б-р князя Гедимина, д. 3 | 1 | 6,5 | 3,0 | 1,625* | 0,1625* | Помещения расположены на 4-м этаже четырехэтажного кирпичного здания в центральной части города. Здание имеет удобные подъездные пути. В помещениях имеется естественное освещение, центральное отопление, электроснабжение, телефонизированы. В здании имеется водоснабжение, канализация. Площади находятся в удовлетворительном состоянии. |
| | 2 | 7,3 | 3,0 | 1,825* | 0,1825* | Помещения расположены на 4-м этаже четырехэтажного кирпичного здания в центральной части города. Здание имеет удобные подъездные пути. В помещениях имеется естественное освещение, центральное отопление, электроснабжение, телефонизированы. В здании имеется водоснабжение, канализация. Площади находятся в удовлетворительном состоянии. Вход в помещение площадью 7,3 кв.м осуществляется через проходное помещение площадью 235,6 кв.м. Условие аукциона – установка потенциальным арендатором двери, отделяющей помещение площадью 7,3 кв.м от помещения площадью 235,6 кв.м. |

* Оплата в белорусских рублях, исходя из размера базовой арендной величины, установленной в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь на день оплаты.

Порядок проведения и оформления участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607).

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, предоставившие организатору следующие документы: представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность, заявление на участие в аукционе, заявление об ознакомлении с документами, порядком проведения аукциона, соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заверенную банком копию платежного документа, о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона, документ, удостоверяющий личность (для физических лиц, для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) (для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц резидентов Республики Беларусь), легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения (для юридических лиц – нерезидентов Республики Беларусь). Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Задаток перечисляется на субсчет 3012000040071 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 500826567, Гродненский филиал РУП «Белтелеком».

Участники аукциона уплачивают штраф в случаях, предусмотренных частью второй пункта 14 Положения о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607), в размере 30 базовых величин.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

**Прием документов на участие в аукционе осуществляется по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. 202 с 23.07.2014 по 21.08.2014 включительно в рабочие дни (с 9.00 до 16.00). Документы, поданные после 16.00 21.08.2014, не рассматриваются.**

**Телефоны для справок (0152) 606805, (0152) 606801, факс (0152) 72 02 07.**

ВТБ

## ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14
Тел.: (+375 17) 309 15 15, (+375 29) 309 15 15, (+375 33) 309 15 15

Финансовая отчетность в соответствии с НСФО за 2 квартал 2014 года размещена на сайте банка по адресу: **www.vtb-bank.by.** УНП 101165625.

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2014 г.

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 299 391 | 208 023 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 2 020 434 | 1 752 867 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 384 112 | 384 518 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 26 773 | 46 395 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 833 693 | 4 178 460 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 495 686 | 397 365 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 1 972 | 472 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 376 139 | 281 206 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 6 368 | 2 752 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 81 497 | 61 633 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 9 526 065 | 7 313 691 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 501 975 | 496 227 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 3 448 711 | 2 427 474 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 4 358 106 | 3 684 425 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 12 726 | 8 733 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 2 456 | 56 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 237 426 | 125 971 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 8 561 400 | 6 742 886 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 434 020 | 84 370 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | 34 320 | 34 320 |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 66 892 | 48 892 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 194 267 | 155 871 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 235 166 | 247 352 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 964 665 | 570 805 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 9 526 065 | 7 313 691 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2014 г.

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 523 544 | 344 919 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 303 258 | 219 254 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 220 286 | 125 665 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 220 913 | 154 931 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 38 595 | 22 463 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 182 318 | 132 468 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 5 | 20 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | (658) | (16 850) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 32 426 | 13 349 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 151 654 | 24 209 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 24 619 | 24 741 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 217 885 | 163 263 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 16 887 | 4 860 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 72 570 | 87 061 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на пибыль | 212 | 18 184 | 19 189 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 54 386 | 67 872 |

**Председатель Правления** **В.В. Иванов**

**Заместитель главного бухгалтера** **Н.А. Куляк**

**Дата подписания «10» июля 2014 г.**

Святлана СВЯТЛІЧНАЯ:

# «Ад салодкага кахання можна «захварэць» на дыябет!»

## Вядомая актрыса пакакетнічала з карэспандэнтам «Звязды»

**Святлана Святлічная міжволі пасля «Брыльянтавай рукі» стала першым савецкім «секс-сімвалам». Актрысе 74 гады, але яна не ўтойвае свой узрост. Выглядае вельмі добра. Яе стройнай фігуры могуць пазайздросціць дзяўчаты, яна носіць міні-спадніцы, і какетнічае з мужчынамі.**

Калі аўтар гэтых радкоў пацікавіўся ў «зоркі» сакрэтам маладосці, Святлана Афанасьеўна чыста па-жаночы зрабіла доўгую паўзу. Задумалася, уважліва паглядзела мне ў вочы, усміхнулася і падзякавала за словы захаплення. А потым адказала шчыра на пытанні. Вельмі шмат новага расказала пра сябе і падчас сустрэчы з прыхільнікамі яе таленту — у віцебскім «Доме кіно». Паверце, калі вы прачытаеце гэты тэкст да канца, ваша ўяўленне аб гэтай Жанчыне будзе іншым, чым можа скласціся пасля чарговага прагляду легендарнай камедыі.


Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

### І НІЯКІХ ДЫЕТ...

— Я насамрэч сёння так добра выглядаю? — запытала мяне Святлана Афанасьеўна і падзякавала за камплімент. Падчас гутаркі здзівіла тым, што ніякіх дыет, гімнастыкі «ад Святлічнай» няма. Напрыклад, калі ёй нешта вельмі захочацца, можа з'есці любую страву ў любы час сутак.

— На днях гартаю меню. Чагосьці хачу, а чаго менавіта?.. Думаю: вось бы бульбачкі з селядцом і піва! І што вы думаеце: не змагла адмовіць сабе ў задавальненні — заказала, — з гумарам сказала яна.

Паколькі мы стаялі вельмі блізка, адразу заўважыў, што пластычных аперацый жанчына не рабіла. Маршчыны на твары, але ўсярэдзіне — «таямнічае святло»: энергетыка прыгажосці, любові да жыцця. Яна быццам чакала гэта пытанне, растлумачыла, што сакрэт маладосці насамрэч унутры яе.

— Я — добры чалавек, люблю жыццё, не злуюся, раблю дабро і атрымліваю ўзамен дабро. І таму, як вы кажаце, у выдатнай форме. І плюс прафесія, якая мяне абавязвае на людзях выглядаць годна. Дзякуючы ёй я не магу сабе дазволіць засмучаць гледачоў. Яны ж мяне чакаюць, уяўляюць, напэўна, якой з'яўлюся перад імі... А калі б я прыйшла *(паказвае)* згорбленая ўся і тоўстая, і ледзь-ледзь нешта сказала ціха, напэўна, падумалі б: «Ой, як жа жыццё змяняе людзей!»

А мне хочацца паказаць жанчынам, якія крыху іншыя, чым я, што можна, трэба і ў такім узросце выглядаць добра! Мне хочацца іх па-добраму «заразіць» гэтым. Каб задумаліся: «Так, наогул можна! Яна ж можа!?

Дзіўна, дарэчы, што «зорка», якая знялася не толькі ў «Брыльянтавай руцэ», а яшчэ прыкладна ў сарака фільмах, не мае звання народнай артысткі. Званне «Заслужаная артыстка РСФСР» ёй было прысвоена ў 1974 годзе.

— Адзінае, што мяне бянтэжыць, дык гэта чаму не прысвоілі званне народнай артысткі? Памятаю, думала ў 50 гадоў, што ўжо такім, як я, даюць... Не! І ў 60 гадоў, і ў 70 не далі! І вось цяпер ужо мне 74! Калі да 80 дацягну, можа быць, дадуць? Як вы думаеце? Вы ведаеце, мяне гэты факт — тое, што «не народная» — перыядычна проста «заядае». Таму што гэтае званне раздалі такім артысткам, якім далёка да мяне. Выбачайце за шчырасць, я проста выказваю тое, што думаю. А калі вы мяне спытаеце, хто вам падабаецца больш за ўсіх, адкажу, што Святлана Святлічная. Мне падабаецца гэты мой запал, стаўленне да навакольнага свету, да людзей і жывёл. Бацькі мяне такой нарадзілі. Дзяўчынку, якая вырасла ў жанчыну, актрысу, маму, бабулю і прабабулю. Апошнім «званнем» я вельмі ганаруся. І мне падабаецца наш малы (праўнук. — **Аўт.**), які атрымаў імя і прозвішча свайго прадзеда — Уладзіміра Івашова (першы муж актрысы. — **Аўт.**).

На жаль, у мяне адносіны з сынам не самыя простыя. Але ўсё ж зрэдку ён і праўнук прыходзяць да мяне ў госці. Я памятаю, перад тым як у школу праўнуку трэба было ісці, хацела яму зрабіць падарункі. Пакуль мяне не было побач, ён маёй прыяцельцы, якая таксама была ў мяне дома, сказаў на вушка: «Мне яна так падабаецца, хачу яе пацалаваць, але саромеюся». І я зразумела, што хлопчык гэты вырасце добрым мужчынам, — працягвае Святлана Афанасьеўна.

Святлана Святлічная афіцыйна была двойчы замужам. Першы муж — Уладзімір Івашоў, з якім яна пражыла вельмі доўга, памёр ва ўзросце ўсяго 55 гадоў. Ён атрымаў сусветную вядомасць, калі быў яшчэ студэнтам Усесаюзнага дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі. «Зорным» стаў, калі сыграў у фільме Рыгора Чухрая «Балада пра салдата». Яму актрыса нарадзіла двух сыноў. Аляксей па спецыяльнасці — стаматолаг. Яшчэ адзін сын актрысы — Алег — памёр у 33 гады... Пра гэта яна расказвае з болем і сёння, называючы сына Алежкам, сонейкам любімым.

### У ІМЯ КАХАННЯ... НА ПАДЛОГУ

Дзеля кахання, калі пачала жыць з першым мужам, яна пагадзілася спаць... на падлозе.

— Вельмі бедная сям'я была ў Валодзі. Бацька ягоны, Сяргей Лук'янавіч — рабочы на авіяцыйным заводзе. Мама, Еўдакія Мікалаеўна — хатняя гаспадыня: трое дзяцей у сям'і! І я трапіла да іх — у камунальную кватэру. Ноччу спалі ў адным пакоі. Калі нарадзіўся наш першы сын, жылі ў тым пакоі шасцёра дарослых і ён. Спалі на падлозе — гэта я пра сілу кахання расказваю. Я ж з забяспечанай сям'і: тата — ваенны, сышоў у адстаўку ў званні палкоўніка. Жылі мы ў Аўстрыі, Венгрыі. Вучылася я ў

> **Нона Мардзюкова, калі мы паглядзелі карціну, сказала: «Ну, што, Светка, вось цяпер мужыкі ўсе будуць тваё!»**

Прыбалтыцы. І раптам сплю на падлозе з Валодзем і яго старэйшым братам (*смяецца*. — **Аўт.**). Не была б так закахана, вядома, не пагадзілася б. Валодзя быў заўсёды вельмі стрыманым. Я часта яму казала: «Ты — мой Карэнін, а я твая Ганна».

Дыск з песнямі ў яго выкананні запісалі. Ён, памятаеце, спяваў «Рускае поле» ў «Няўлоўных мсціўцах». Спрабаваў Кабзон, але зразумеў, што гэта спяваць трэба не голасам, а юнай душой. І ў «Баладзе пра салдата» планавалі ўпачатку зняць Стрыжэнава. Але рэжысёр Чухрай, калі трапіў у бальніцу з сардэчнай праблемай, зразумеў, што нешта з ім не атрымліваецца. Бо на ролю салдата трэба браць не спрактыкаванага артыста, а наіўнага хлопца.

У кіно вельмі важныя дэталі, фактура, вочы. Наўрад я з маімі цяперашнімі вачыма ў «Сямнаццаці імгненнях вясны» магла б сыграць Габі (журналістку, закаханую ў Шцірліца. — **Аўт.**).

### СТАРАСЦЬ БЫВАЕ ПРЫГОЖАЙ

«Зорка» сыграла многія, на жаль, не ўсім добра вядомыя галоўныя і эпізадычныя ролі. Напрыклад, у 1963 годзе ў карціне «Ім скараецца неба» яна сыграла ролю ўдавы пілота, які загінуў падчас выпрабаванняў рэактыўнага самалёта. Пасля выхаду карціны з ёй пазнаёмілася ўдава лётчыка, які таксама загінуў. Яна запытала: «Як дзяўчына ў 23 гады магла сыграць так праўдападобна? Тыя ж эмоцыі я перажыла ў жыцці».

А як цудоўна Святлічная сыграла адну з галоўных роляў у фільме «Кахаць...», які быў зняты ў 1968 годзе рэжысёрам Міхаілам Навумавічам Калікам. Ён і цяпер з-за акіяна часта тэлефануе Святлане Афанасьеўне.

— Рэжысёр з'ехаў з СССР у ЗША, і фільм той «парэзалі», потым — на паліцу. А фільм вельмі цікавы, а акцёры якія: мой партнёр Леў Круглы (таксама потым эміграваў, ужо памёр. — **Аўт.**), Аліса Фрэйндліх, Андрэй Миронаў, Ігар Кваша, Марыяна Вярцінская. У кіно тым экранізаваны чатыры навелы па матывах апавяданняў некалькіх аўтараў. Адзін з іх — Юрый Паўлавіч Казакоў, адзін з найбуйнейшых прадстаўнікоў навелістыкі. Я іграла дзяўчыну, якая прыехала ў Маскву да каханага. З ім пазнаёмілася мая гераіня, калі мужчына прыехаў у горад, дзе яна жыве, у камандзіроўку... У мастацкае кіно акуратна ўплятаецца дакументальнае, знятае скрытай камерай. На пытанне, што значыць кахаць, адказваюць людзі на вуліцы. Усе гэтыя навелы каментаваў святар Аляксандр Мень: вельмі даходліва, мудра і цікава... Айцец Аляксандр быў зняты невыпадкова, бо кожная навела пачынаецца цытатай з «Песні песняў» са Старога Запавету.

А прыкладна год таму я пазнаёмілася з прататыпам жанчыны, якая натхніла Казакова на стварэнне твора. Яны, дарэчы, жылі шчасліва некалькі гадоў, але... Мне патэлефанаваў рэжысёр дакументальнага кіно і прапанаваў сустрэцца з ёй. Сказаў, што за здымкі заплаціць не зможа. Я ў адказ сказала, што не ўсё вымяраецца грашыма. Па дарозе да дома Марты Дзмітрыеўны купіла вялікі букет ландышаў, каб падарыць. Яна каля пад'езда сядзела на лаўцы і чакала мяне. Сівая, блакітнавокая, духмяная! (менавіта так сказала актрыса. — **Аўт.**). Прататыпу маёй гераіні тады было ўжо 85 гадоў. Па адукацыі яна — філолаг, шэкспіразнаўца. Дзякуючы ёй я зразумела, якая бывае прыгожая старасць — яна такая «цёплая». Дакументальны фільм пра нашу сустрэчу быў запланаваны да паказу ў адукацыйным цэнтры пры храме. Зала на трэцім паверсе. На прапанову дапамагчы ёй падняцца па лесвіцы яна сказала:

> **Пісалі, што на фестывалі ў Благавешчанску я была нецвярозая, але і гэта — хлусня! Я проста пры людзях, як дзіцё, радавалася таму, што мне падарылі вялікую скульптуру бусла.**

«Не, ведаю свае магчымасці. Вы ідзіце і глядзіце, а спусціцеся і мне раскажаце». Так ціха і мудра гэта яна сказала, што ўнутры мяне ўсё перавярнулася. Яна пры дапамозе мужчын паднялася ўсё ж! — з цеплынёй расказвае «зорка».

Новую ролю, якую ёй ужо прапанавалі, — ролю манашкі.

### У ЯЕ ЗАКАХАЎСЯ НАВАТ... БРЭЖНЕЎ

У тым жа 1968 годзе Святлічная знялася ў «Брыльянтавай руцэ». Але менавіта той поспех адыграў не самую лепшую ролю ў яе біяграфіі і творчасці.

— Да мяне на тую ролю спрабавалася іншая, ды не атрымалася. Рада, што мяне за суткі зацвердзілі. Знялася і стала знакамітай. Нона Мардзюкова, калі мы паглядзелі карціну, сказала: «Ну, што, Светка, вось цяпер мужыкі ўсе будуць тваё!» Гэта прыемна, вядома, але хутка заўважыла, што многія жанчыны, наадварот, ставіліся да мяне з непрыязнасцю, бо раўнавалі сваіх мужчын. Выступала часта я ў інстытутах. Аднойчы — у Краснадары, памятаю — дзікая спякота, а ў маленькай зале, напэўна, больш за 1000 чалавек. Студэнты і выкладчыкі прыйшлі, каб на «Ганну Сяргееўну» паглядзець жыўцом. Некаторыя студэнткі страчвалі прытомнасць ад спёкі, але ўбачылі мяне... Пасля гэтай ролі мяне часта не бралі ў карціны, дзе хацела зняцца, і рэжысёры адмаўлялі нярэдка. Маўляў, яна можа сыграць толькі жанчыну-вамп, даму пэўнай рэпутацыі. Гэта няпраўда, таму што пасля той камедыі былі і сур'ёзныя працы ў кіно... Мой вобраз у камедыі атрымаўся ў многім дзякуючы Нікуліну. Калі б хтосьці іншы разам са мной здымаўся, мо Ганна Сяргееўна не была б такая параўнальна нявінная, без «пошласці». Той танец, усе гэтыя крыўлянні — гэта нашы імправізацыі з Юрыем Нікуліным. Ён такі быў чалавек, што пасля пяці хвілін знаёмства з ім, здавалася, нібы ведаеш яго даўно. Дарэчы, «інтымную сцэну» ў фільме дырэктар савецкага тэлебачання Лапін загадаў выразаць, пасля таго як яна была паказана. І нейкі час не было пікантнага фрагмента. Але да гэтага карціну паказалі Брэжневу. Магу пахваліцца, што ён закахаўся ў Ганну Сяргееўну. Калі яму другі раз прывезлі паглядзець фільм, але без знакамітай сцэны, ён сказаў: «Ну прывязіце мне з гэтай жанчынай!» І кадры вярнулі ў стужку. Пагадзіцеся, без іх у цэлым было б менш смешна і цікава. Дзякуючы фільму паверыла, што я магу многае — у гэтым пераконваюся на працягу жыцця, — распавядае актрыса.

Пра яе мінулых і цяперашніх бой-фрэндаў перыядычна паведамляюць жоўтыя СМІ.

— Калі мне «прыпісваюць» бой-фрэнда, непрыемна, бо гэта — хлусня. Калі ўжо так цікава, запыталіся б у мяне перад тым, як пісаць такое. На адной з прэс-канферэнцый, калі задалі пытанне па гэтай тэме, я сказала, што не вар'ятка, каб сустракацца з маладым чалавекам, які маладзейшы за маю ўнучку. І дадала, што я не Ала Пугачова. Я не асуджаю яе, проста я — іншая. А яшчэ ў маскоўскіх СМІ пісалі, што на фестывалі ў Благавешчанску я была нецвярозая, але і гэта — хлусня! Я проста пры людзях, як дзіцё, радавалася таму, што мне падарылі вялікую скульптуру бусла. Такі ён прыгожы. Калі ўбачыла яго, падумала, як бы я хацела, каб у мяне дома быў такі бусел. Чаму? Я веру ў сны. А калі паступала ў інстытут на актрысу вучыцца, была ўпэўнена ў гэтым, бо мне прысніўся белы бусел, якога злавіла і прывезла дадому. Намёк на тое, што злавіла шчасце. Таму для мяне бусел — асаблівая птушка. Пасля паведамленняў пра нецвярозую Святлічную журналіст з Благавешчанска, які раней гутарыў са мной, запрасіў на тэлебачанне — на аўтарскую праграму. Потым напісаў цудоўнае эсэ, у якім шмат разоў паўтараў: «Не вінаватая яна ў тым, што...». Такім чынам ён абараніў мой гонар, — прызнаецца актрыса.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### АФАРЫЗМЫ АД СВЯТЛІЧНАЙ

**Мала хто ведае, што яна прыдумвае афарызмы. Прызналася што быццам неба іх надыктоўвае. Цяпер, праўда, піша рэдка. А параіў ёй даўным-даўно заўсёды мець пры сабе аловак Васіль Шукшын. «Зорка», дарэчы, не валодае камп'ютарам, інтэрнэтам. Пажартавала, што можа ўключыць толькі прас.**

Вось афарызмы:

***Мудрасць — напой, настоены на ўроках жыцця.***

Губляючы ўсё, думаеш, што страціў мала. Губляючы мала, думаеш, што страціў усё.

***Ноч не страшная. Страшныя думкі аб ёй.***

Розумам не кахаюць, кахаюць безразважна.

***Ад салодкага кахання можна захварэць на дыябет.***

Глыбокае пачуццё спачатку перапоўніла, а потым патапіла душу.

***Разбітае каханне не варта рэстаўраваць.***

Яна залізвала раны кахання моўчкі, як сабака.

***Быць пакрыўджаным — доля слабых.***

Душа больш не адчувае — з-за атлусцення.

***Яна жыла з ненавісным ёй чалавекам і гэтым чалавекам была яна сама*** (прызналася, што было такое і ў яе жыцці. — **Аўт.**).

Бегла жыццё, задыхаючыся ад несправядлівасці.

***Талент можа звяць, калі яго не паліваць прызнаннем.***

Маўчанне — гэта самы красамоўны маналог.

***Можна губляць што заўгодна, акрамя сумлення.***

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

### ПАГОДА Ў ДОМЕ

Канстанцін Міхайлавіч Барэль, што на здымку, узначальвае службу, якая імкнецца, каб у Свіслацкім раёне была добрая пагода ў кожным доме. Афіцыйна — ЖКГ РУП. Вось ужо ў дзясяты раз звяздоўскія рашальнікі пазіцый на 64-клетачных дошках будуць спаборнічаць на прызы працавітага калектыву, што невыпадкова, бо на прадпрыемстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі старадаўняя гульня ў пашане. А сам дырэктар стаў двойчы чэмпіёнам Беларусі па завочных шашках — па класічнай версіі і ў турніры з лёсаваннем дэбютаў. Міністэрства спорту і турызму прысвоіла яму ганаровае званне нацыянальнага майстра па гэтым інтэлектуальным відзе спорту.



Конкурс мы так і назвалі «Пагода ў доме». Будуць адзначаны яго пераможцы, суддзя і лепшая рашальніца. У ім устаноўлена норма першага спартыўнага разраду.

Усяго будзе 24 заданні, падрыхтаваныя вядучым рубрыкі са сваёй практыкі. Кожнае ацэньваецца ў адно ачко. У першых трох пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць:



1. **Белыя**: b2, e7, f4, g3, g5, h4 (6). **Чорныя**: b8, c3, d2, d4, e3, g7, h2, h8 (8).



2. **Белыя**: b6, c5, c7, d4, d6, e5, h6 (7). **Чорныя**: a7, b2, b8, c3, d2, f8, g7 (7).

3. **Белыя**: e5, f6, g1, g5, дамкі b8 d8 (6). **Чорныя**: b2, e3, e7, f2, g3, h2, h6 (7).

о о о

Адказы на працягу двух тыдняў накіроўвайце на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, газета «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

### РАШЭННІ

**«Перад конкурсам»** (М. Грушэўскі): **№ 1**— f8, h6!, e3 (d2) h6:f4:d6:e3! (b6) d4 (a5) c5x, **№ 2** — b2, gf8, d8, b6!, d6 (c3) ab4, e5 (c7, g7A) e5 (h6) c3 (g5) d2 (h4) e1 (b4, g3) b6 (h2) g1#. A(b4) e5x, **№ 3** — c7, e7, a5, a5:c3!, c5x і **№ 4** — c7, f6, b6, d4, e3, e7, h6x.

**Аўтарскі-18** (В. Шульга): **№ 23** — 41, 13, 4 (27 AB), 15 (41 C) 4, 39, 50x. C (14) 47, 17, 50x. A (41) 15 (14), 36, 17, 50x. B (14) 42, 47, 17, 50x і **№24** — 27 (22A) 37, 1 (29BC) 45, 28x. B (25:34) 28 x. C (18) 28 x. A (32) 37, 1 (18D) 27/22 x. D (29) 45x.

### Даты | Падзеі | Людзі



**1380** год — у гэты дзень у Маскву прыбыў ганец з «поломянной» (палымянай) весткай аб тым, што правіцель Арды Мамай на чале незлічонага войска з «двунадесяти языков» выступіў у паход на Русь. У адказ вялікі князь маскоўскі Дзмітрый Іванавіч — будучы Дзмітрый Данской — заклікаў усіх рускіх князёў дасылаць атрады да месца збору ў Каломну. Так пачалася падрыхтоўка да вялікай бітвы на Куліковым полі.

**1767** год — нарадзіўся Мацей Кажынскі — спявак, акцёр, рэжысёр. Заснавальнік першага пастаяннага тэатра ў Мінску. Выступаў у драмах і камедыях, спяваў басовы рэпертуар у операх. У 1801 годзе стварыў у Гродне оперна-драматычную трупу, з якой у пачатку 1802-га пераехаў у Мінск. Тут ён паставіў оперы Расіні «Севільскі цырульнік», Сарці «Вясковая рэўнасць», Сальеры «Школа раўнівых» і іншыя. Аўтар п'есы «Айцу айчыны яго ўдзячныя дзеці». Памёр у 1823 годзе.

**1874** год — запатэнтавана электрычная лямпа Ладыгіна. Чалавецтву спатрэбілася некалькі тысяч гадоў, каб прайсці шлях ад першых алейных лямпаў і паходняў да свечкі. Але менш за 150 гадоў, каб перайсці ад эксперыментаў з электрычным токам да стварэння сучасных лямпачак. У пачатку 70-х гадоў пазамінулага стагоддзя рускі вынаходнік Аляксандр Мікалаевіч Ладыгін сканструяваў больш дасканалую лямпу, чым іншыя вынаходнікі да яго. Ён ператварыў яе з фізічнага прыбора ў сродак для асвятлення. У 1873-м Ладыгін упершыню прадэманстраваў сваю вынаходку. А 23 ліпеня 1874 г. запатэнтаваў яе. Але слава вынаходніка электрычнай лямпачкі дасталася іншаму навукоўцу — амерыканцу Томасу Эдысану, які змог зрабіць гэты прыбор прадметам шырокага спажывання.

### Было сказана

**Кузьма ЧОРНЫ, пісьменнік, публіцыст:**

***«Вялікі доктар усялякай хворасці ў чалавечай душы — час — мае вечнага свайго дапаможніка — працу».***

**НАРОДЖАНЫЯ 23 ліпеня**

**У сваёй аснове яны знаўцы традыцый і асноў, у любой сферы імкнуцца дайсці да самай сутнасці. У сваім падыходзе да рэчаіснасці яны арыентаваны на розум, а іх эмацыянальнае жыццё не можа заставацца нявыяўленым. Ім было б карысна звярнуцца да асабістага ўнутранага свету, аб'яднаць сваю грамадскую дзейнасць з эмацыянальным жыццём, чаму могуць паспрыяць пазітыўныя адносіны з каханым, сябрам, якім народжаныя ў гэты дзень могуць прапанаваць здольнасць да рашэння праблем, спагаду, разуменне і чалавечнасць. З людзей гэтага дня атрымліваюцца бліскучыя псіхолагі, сацыяльныя работнікі, юрысты, урачы.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 5.08 | 21.23 | 16.15 |
| Віцебск | — 4.51 | 21.19 | 16.28 |
| Магілёў | — 4.58 | 21.13 | 16.15 |
| Гомель | — 5.03 | 21.02 | 15.59 |
| Гродна | — 5.25 | 21.37 | 16.12 |
| Брэст | — 5.33 | 21.30 | 15.57 |

### Месяц

***Маладзік 27 ліпеня. Месяц у сузор'і Цяльца.***

### Імяніны

***Пр.** Аляксандра, Антона, Данілы, Пятра.*

***К.** Брыгіты, Ганны, Яны, Апалінара.*


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Жанчыны кажуць, што нам, мужчынам, лягчэй. Знайшоў дзве шкарпэткі — ужо апрануўся. Ага, хай яны паспрабуюць знайсці дзве аднолькавыя шкарпэткі!**

Адэса.
— Фіма, у вас чай ёсць?
— Не.
— А кава?
— Чай ёсць.

**Ды што там каня на скаку... Ёсць жанчыны — лёгкім паваротам руля спыняюць да тысячы аўтамабіляў!**

— Калі я ў першы раз выходзіла замуж, у запале нагу зламала...
— І што, уцёк жаніх?
— Ды куды ён пойдзе з паламанай нагой?



caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.662. Індэкс 63850. Зак. № 2986.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 22 ліпеня 2014 года.